Голас Радзімы

№ 11 (1633)
20 сакавіка 1980 г.

ГАЗЕТА БЕЛАРУСКАГА ТАВАРЫСТВА ПА КУЛЬТУРНЫХ СУВЯЗЯХ З СУАЙЧЫННІКАМІ ЗА РУБЯЖОМ
(БЕЛАРУСКАЕ ТАВАРЫСТВА «РАДЗІМА»)

Выдаецца з 1955 г.
Цана 4 кап.



...І снежная зіма не страшная, калі на дапамогу прыходзіць чалавек.

Фота С. КРЫЦКАГА.

АКТУАЛЬНЫЯ ДАСЛЕДАВАННІ
(«Час пошукаў і здзяйсненняў»)
стар. 3

СУР'ЁЗНАЯ ЗАКЛАПОЧАНАСЦЬ НАШЫХ СУАЙЧЫННІКАЎ
(«Пішуць землякі»)
стар. 4

...І ПАДАРОЖНІК, І ВОІН, І ВУЧОНЫ
(«Сем прыгод Богуш-Сестранцэвіча»)
стар. 7, 8

ПЛЕНУМ ЦК КПБ

На чарговым пленуме ЦК КПБ, які адбыўся 12 сакавіка ў Мінску, абмеркавана пытанне аб рабоце прафсаюзных арганізацый рэспублікі па павышэнню эфектыўнасці грамадскай вытворчасці, вырашэнню сацыяльных і выхаваўчых задач. З дакладам выступіў старшыня Беларускага рэспубліканскага савета прафесіянальных саюзаў М. Полазаў.

Разгледжаны таксама пытанні першай сесіі Вярхоўнага Савета БССР.

На пленуме выступіў кандыдат у члены Палітбюро ЦК КПСС, першы сакратар ЦК КП Беларусі П. Машэраў.

УЗНАГАРОДА ЗА ПРАЦУ

У той жа дзень на рэспубліканскім сходзе партыйнага, савецкага, прафсаюзнага і камсамольскага актыву, праведзеным сумесна з прадстаўнікамі працоўных калектываў Беларускай ССР, быў уручаны пераходны Чырвоны сцяг ЦК КПСС, Савета Міністраў СССР, ВЦСПС і ЦК ВЛКСМ. Ганаровую ўзнагароду ўручыў старшыня Усесаюзнага Цэнтральнага Савета Прафесіянальных Саюзаў (ВЦСПС) А. Шыбаеў.

На гэтым жа сходзе быў падпісаны Дагавор аб сацыялістычным спаборніцтве паміж Літоўскай ССР і Беларускай ССР на 1980 год.

СЕСІЯ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР

13—14 сакавіка 1980 года ў Мінску адбылася першая сесія Вярхоўнага Савета Беларускай ССР дзесятага склікання. Яна разгледзела шырокае кола пытанняў, у тым ліку ўтварыла ўрад рэспублікі — Савет Міністраў БССР, пастаянныя камісіі Вярхоўнага Савета і Камітэт народнага кантролю БССР, выбрала Прэзідыум Вярхоўнага Савета БССР і Вярхоўны суд БССР.

Старшынёй Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР абраны І. Я. Палякоў. Старшынёй Савета Міністраў Беларускай ССР назначан А. Н. Аксёнаў. Абмеркавана пытанне аб эфектыўнасці выкарыстання меліяраваных зямель у рэспубліцы.

● ПАДЗЕІ ● ЛЮДЗІ ● ФАКТЫ ● ПАДЗЕІ ● ЛЮДЗІ ● ФАКТЫ ●

МАГІЛЁЎСКІЯ ЗЕМЛЯВОЗЫ

Новы магутны аўтасамазвал маркі МаАЗ-6507 створаны на Магілёўскім аўтазаводзе. Вышэйшая першая прамысловая партыя такіх землявозаў. На будаўніцтве Маскоўскага метрапалітэна і Кіеўскай гідраэлектрастанцыі яны атрымалі высокую ацэнку эксплуатацыйнікаў. Скорасць новых машын — 55 кіламетраў у гадзіну, грузападымальнасць — 20 тон. Яны вызначаюцца высокай манеўранасцю і праходнасцю.

ЗАПРАСІЛІ АГРАНОМА

Урок хіміі ў дзевятым класе школы калгаса «Савецкая Беларусь» Жыткавіцкага раёна па тэме «Мінеральныя ўгнаенні» вядзе калгасны аграном Ніна Жыткавец. Ёй ёсць што расказаць школьнікам. У мінулым годзе калгас атрымаў па 32,5 цэнтнера збожжавых, больш за 150 цэнтнераў бульбы, 300 цэнтнераў буракоў з гектара. На канкрэтных прыкладах аграном паказала вучням, як праграміруецца ўраджай, складаюцца картаграмы ўнясення ўгнаенняў у глебу. Пасля такіх урокаў вучні працуюць над рэфератамі. А вясной — практыка на калгасных палях.

ЖЫТНЯЯ НІВА

Стан пасеваў жыта здавальняючы — такое заключэнне аграметэаролагаў, што абследавалі азімую ніву Беларусі. Расліны добра пераносяць складаныя ўмовы зімоўкі. Паспрыяў высокі ўзровень агратэхнікі. Асноўныя плошчы займае жыта сорту «белта», які дае стабільна высокія ўраджаі. Адначасова гаспадаркі пачалі высяваць кароткасцеблавыя і больш устойлівыя да палягання сарты «ўсход-1», «чулпан», «беларускае-23».

РАЗАМ З ВУЧОНЫМІ

Незвычайны інструмент — электрамагнітнае поле — з'явіўся ў шліфавальшчыкаў Мінскага аўтазавода. Устаноўка, зманціраваная з дапамогай вучоных Фізіка-тэхнічнага інстытута Акадэміі навук БССР, дазволіла скараціць час на шліфоўку кожнай дэталі з паўгадзіны да некалькіх мінут. Палепшылася якасць вырабаў, скарацілася колькасць рабочых, занятых на аперацыі.

Гэта толькі адна з 60 распрацовак, укаранёных у гэтай пяцігодцы спецыялістамі завода сумесна з вучонымі васьмі акадэмічных устаноў рэспублікі, Беларускага політэхнічнага інстытута, іншых навуковых устаноў.

І ЛЕТАМ І ЗІМОЙ

Побач з цэнтральнай сядзібай саўгаса «Стара-Барысаў» будуецца цяплічны камбінат. Яго карысная плошча зойме шэсць гектараў. З уводам у строй новых цяпліц збор ранняй гародніны ў саўгасе павялічыцца ў два разы. З'явіцца магчымасць вырошчваць яе круглы год.

МАЛАДЫЯ ТАЛЕНТЫ

Ад невялікага танцавальнага гуртка да масавага калектыву, удастоенага звання народнага, — такі шлях прайшоў ансамбль танца «Равеснік» Пінскага гідрамеліярацыйнага тэхнікума. Цяпер у яго рэпертуары больш за сорак складаных харэаграфічных кампазіцый. Кіруе калектывам таленавіты педагог Валерый Чарнышоў.



Каля васьмідзесяці назваў гатовых лякарстваў і раствораў у ампулах выпускае Барысаўскі хіміка-фармацэўтычны завод. Прадукцыя яго карыстаецца вялікім попытам як у Савецкім Саюзе, так і за мяжой: ГДР, Афганістане, паступае ў міжнародны дзіцячы фонд ААН.

НА ЗДЫМКУ: участак па вырабу спіртавых раствораў і экстрактаў.

● ПАДЗЕІ ● ЛЮДЗІ ● ФАКТЫ ● ПАДЗЕІ ● ЛЮДЗІ ● ФАКТЫ ●



Пройдзена больш 3 700 метраў трасы Мінскага метрапалітэна. Працягваецца будаўніцтва станцый «Маскоўская», «Акадэмія навук», «Інстытут культуры», «Плошча Леніна». Намячаецца закладка новых: «Плошча Я. Коласа», «Плошча Перамогі», «Ацябрская». Сёлета запланавана прайсці 2 740 метраў тунеляў.
Усе станцыі метро будуюцца адкрытым спосабам. Над іх афармленнем працуюць лепшыя беларускія архітэктары.
НА ЗДЫМКАХ: старшы архітэктар інстытута «Мінскпраект» К. ВЯЗГІН за распрацоўкай дэкаратыўных элементаў афармлення вестыбюля станцыі метро «Парк Чэлюскінцаў»; на адным з участкаў гатовага тунеля.

Фота Ч. МЕЗІНА.

ПРАБЛЕМЫ КІРАВАННЯ «НЕКІРУЕМЫМ ВЫБУХАМ АГЛАМЕРАЦЫІ»

ЦІ ЎЗНІКНУЦЬ ГАРАДЫ-МАЦЕРЫКІ?

Гарады з больш чым стотысячным насельніцтвам і сёння мы, дэмографы, адносім да вялікіх. А ці многа іх было гадоў сто назад? Дакладна невядома, але думаю, ад сілы тузін-другі. Нават у 1800 годзе — усяго 45. Затое к 1950 — ужо 875, к 1975 — за 2 000. У СССР іх на студзень 1979 года было 272 супраць 89 у 1939 годзе. Лік, бачыце, патроіўся за 40 гадоў. А «мільянераў» стала ў дзесяць разоў больш.

«Небывалымі» маштабы ўрбанізацыі можна было назваць і раней. Але ў XX стагоддзі размах і характар яе такія, што дэмографы загаварылі аб гіперурбанізацыі. Сапраўды, гарады не проста памнажаюцца і растуць. Распаўзаючыся ўшыр, яны зліваюцца адзін з адным у агламерацыі. Напрыклад, Маскоўская агламерацыя аб'яднала ўжо звыш 130 населеных пунктаў у радыусе да 100 кіламетраў ад сталіцы. Сочынская выцягнулася на 150 кіламетраў вузкай паласой па беразе Чорнага мора. «Галактык», дзе жыхароў звыш 500 тысяч, у СССР дзесяткі. Але самыя вялікія — за мяжой: Нью-Йоркская, Лонданская, Такійская, Калькуцкая...

Гэта не ўсё. Узніклі агламерацыі агламерацый — канурбацыі. Буйнейшыя — у ЗША: Босваш (Бостан-Вашынгтон), Чыпітс (Чыкага-Пітсбург), Сансан (Сан - Францыска-Сан-Дыега)... Толькі гэтыя тры, як іх назвалі, мегалапалісы (ад грэчаскіх слоў «вялікі» і «горад») к 2000 году ўбяруць, відаць, 150 мільёнаў жыхароў ЗША (звыш 50 працэнтаў). Дэльтаполіс АБК (Амстэрдам-Брусэль - Кёльн) — да 50 мільёнаў еўрапейцаў. А ў пачатку XXI стагоддзя на Зямлі будзе, напэўна, больш за 160 такіх урбанічных калосаў.

«Ці не ператворацца з часам цэлыя дзяржавы ў суцэльныя звышгарады?» — б'юць трывогу ва ўсім свеце. Гавораць, палісмен на лонданскай Пікадзілі, напрыклад, удыхаючы выхлапныя газы, атручвае сябе так, як быццам выкурвае па 100 цыгарэт на дзень. Не толькі ў індустрыяльна - транспартных цэнтрах, а і ў прыгарадах з іх табунамі аўтамабіляў людзі вымушаны «глытаць» аднаго толькі свінцу, апрача іншых шкодных выкідаў, разоў у 100 больш, чым у часы нашых дзядоў. І ўсё часцей пытаюцца: чаму б не ўзяць урбанізацыю пад кантроль грамадства?

ГЕНЕРАЛЬНЫЯ ПЛАНЫ РАЗВІЦЦЯ І РЭКАНСТРУКЦЫІ ГАРАДОЎ НА 25—30 ГАДОЎ

Планавасць народнай гаспадаркі, здавалася б, аўтаматычна забяспечвае кіраванне будучым гарадоў. Але і ў СССР ім уласціва самаразвіццё. Даўно ўжо скончыўшы з прыватнай уласнасцю на зямлю і іншыя сродкі вытворчасці, савецкае грамадства да сённяшняга дня «збірае плён» былой хаатычнай забудовы, ахопленай рынкавай стыхіяй. Нават лепшая тэорыя ўрбанізму не мае права ігнараваць гістарычна існуючыя схемы, няхай не лепшыя, але якія надоўга прадвызначылі яго практыку. Недапушчальна, скажам, зносіць каштоўныя помнікі архітэктуры, як бы ні перашкаджалі яны сучаснай планіроўцы. Такіх праблем вельмі многа.

І яшчэ: іх ускладніла навязаная нашай краіне вайна 1941—1945 гадоў: звыш 1 700 гарадоў і пасёлкаў СССР ператварыліся ў руіны. Без прытулку засталіся 25 мільёнаў чалавек. Трэба было хутчэй забяспечыць людзей жыллём, усім неабходным.

Тым не менш вынікі і перспектывы ўрбанізацыі ў СССР не так і шматпраблемныя, як на Захадзе. Яна даўно ўжо ўзята пад кантроль генеральнымі планамі рэканструкцыі і развіцця гарадоў, разлічанымі на 25—30 гадоў, Генеральнай схемай рассялення на тэрыторыі СССР да 1990 года. Стратэгія і тактыка кіравання зыходзіць з прагнозаў да 2000 года і далей.

І вось вынік: агламерацыі ў СССР не такія вялікія, а галоўнае, не растуць няспынна, як на Захадзе. Не буду гаварыць аб Сочынскай: гэта ланцуг курортаў, «субтрапічны рай». Вазьму Маскоўскую, буйнейшую ў СССР (прыкладна 13 мільёнаў жыхароў). Цэнтр яе як індустрыяльна-транспартны гігант параўнальны з Лонданам, Нью-Йоркам або Токіо. Але паветра ў Маскве намнога чысцейшае, чым у любым падобным горадзе за мяжой. Не атручаны і воды, у Маскве-рацэ ёсць рыба. Сталіцу акружае лесапаркавы пояс. За ім — дачныя месцы, палі, фермы. Прыродны газ працягвае выцясняць дровы, вугаль, мазут з топак у гарадах і пасёлках вобласці. За эфектыўнасцю ачысных збудаванняў на прадпрыемствах сочаць дзяржаўная інспекцыя і грамадскія кантралёры.

На базе Маскоўскай агламерацыі фарміруецца вялікая ўрбанізаваная зона Цэнтральнага эканамічнага раёна (12 абласцей). Амаль 2/5 яго плошчы пакрываюць лясы. Але калі людзей тут усё больш (11 працэнтаў жыхароў краіны на 2 працэнты яе тэрыторыі), ці не выцесняць зеляніну гарады і пасёлкі, якіх тут ужо звыш 600? Думаю, не. Вядома, не можа быць і гутаркі аб тым, каб неяк рэгламентаваць натуральны прырост насельніцтва. Але планавае будаўніцтва, ахова прыроды законамі і спецыяльнымі мерамі павінны прадухіліць з'яўленне каменных Левіафанаў у гэтым і іншых рэгіёнах СССР.

НА ШЛЯХУ ДА «НУЛЯВОГА ПРЫРОСТУ» НАСЕЛЬНІЦТВА

Жыхароў у СССР к 2000 году будзе, відаць, 300 мільёнаў — удвая больш, чым у пачатку XX стагоддзя. Але падваення за наступныя 100 гадоў мы не чакаем. Ёсць прагнозы: насельніцтва краіны дасягне стабільнай колькасці (330—400 мільёнаў) паміж 2050 і 2100 гадамі. Далейшы прырост стане «нулявым»: колькі нарадзіцца, столькі і смярцей. А доля гараджан? Верагодна, к 2000 году яна перавысіць 75 працэнтаў супраць 62 сёння і 33 працэнтаў у 1939 годзе.

Гарадоў у СССР ужо звыш 2000 — удвая з лішнім больш, чым у 1939 годзе. Кожны год дадаецца да іх 15—20 новых. Да 2000 года з'явяцца яшчэ прыкладна 600, большасць у Сібіры, дзе вялікія малаабжытыя і ўвогуле бязлюдныя месцы.

Цікавыя ідэі Мікалая Мілюціна (СССР). Яго канцэпцыя занальнай забудовы (1929 год) увайшла ў залаты фонд сусветнага ўрбанізму. Уявіце: уздоўж магістралі на дзесяткі, а затым і сотні кіламетраў выцягваюцца паралельна тры зоны: прамысловая (адгароджаная ад іншых поясам зеляніны), жылая і аддадзеная сферы культуры, адпачынку, спорту. Уплыў гэтага падыходу адчуваецца, напрыклад, у планіроўцы волжскага горада Тальяці, некаторых праектах прасторавай арганізацыі агламерацый у СССР і за мяжой, скажам, у лінейна-няспыннай схеме рассялення для ПНР. Падобныя задумы ўвасоблены пры стварэнні Брацка-Усць-Ілімскага тэрытарыяльна - вытворчага комплексу ў Сібіры; яго вопыт вывучае Міжнародны інстытут прыкладнога сістэмнага аналізу (Вена) як магчымую мадэль рашэння для розных краін. Найбольш перспектыўная яна, зразумела, ва ўмовах планавай гаспадаркі.

Савецкія горадабудаўнікі супрацоўнічаюць і з замежнымі калегамі. Больш цесная кааперацыя і шырокі абмен вопытам дапамогуць процістаяць націску каменных Левіафанаў.

Барыс УРЛАНІС,
прафесар, доктар эканамічных навук.

НА ФІНІШЫ ПЯЦІГОДКІ: ЯКІ ЎКЛАД ВУЧОНЫХ?

Адбыўся гадавы Агульны сход Акадэміі навук БССР.

Асноўныя навуковыя дасягненні акадэміі за мінулы год ахарактарызаваў прэзідэнт АН БССР, Герой Сацыялістычнай Працы, член-карэспандэнт Акадэміі навук СССР Мікалай БАРЫСЕВІЧ.

Даклад аб навуковай і навукова-арганізацыйнай дзейнасці акадэміі зрабіў галоўны вучоны сакратар прэзідыума АН БССР, член-карэспандэнт АН БССР Леанід КІСЯЛЕЎСКІ.

Мінулы год заняў асаблівае месца ў біяграфіі Акадэміі навук БССР: флагману беларускай навукі споўнілася паўстагоддзя. Высокую ўзнагароду — ордэн Леніна, які прымацаваў да сцяга акадэміі кандыдат у члены Палітбюро ЦК КПСС, першы сакратар ЦК КПБ П. Машэраў, беларускія вучоныя ўспрынялі як заклік да далейшага

ЧАС ПОШУКАЎ І ЗДЗЯЙСНЕННЯЎ

павышэння эфектыўнасці творчага пошуку, барацьбы за паскарэнне ўкаранення яго вынікаў у народную гаспадарку. На гадавым Агульным сходзе былі дэталёва прааналізаваны поспехі і недахопы даследчай і арганізацыйнай дзейнасці інстытутаў і іншых падраздзяленняў акадэміі, вызначаны найбольш актуальныя напрамкі навуковага пошуку ў завяршальным годзе пяцігодкі.

Адзначалася, што напярэдадні святкавання 110-й гадавіны з дня нараджэння У. І. Леніна асаблівую значнасць набылі даследаванні, звязаныя з жыццём і шматграннай дзейнасцю правадыра пралетарыяту па стварэнню першай сацыялістычнай дзяржавы, з перамогай ленінскіх ідэй у справах будаўнікоў камунізму. Каштоўнасць у гэтых адносінах мае калектыўная праца «Ленінізм і трыумф навуковага матэрыялістычнага светапогляду ў СССР». У ёй аналізуецца значэнне ленінскай тэарэтычнай спадчыны для развіцця філасофіі і эканамічнай думкі, роля ленінізму ў фарміраванні сацыялістычнай ідэалогіі ў СССР. У гэтым жа напрамку працавалі філосафы, якія завяршылі даследаванне «Сацыялізм і развіццё савецкага ўкладу жыцця».

Актуальныя працы эканамістаў, якія абгрунтавалі метадалагічныя прынцыпы аналізу эфектыўнасці грамадскай вытворчасці ў рамках рэспублікі.

Адным з важных дасягненняў было стварэнне Музея старажытнай беларускай культуры, этнаграфіі і археалогіі пры Інстытуце мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору, дзе сабраны унікальныя экспанаты, якія маюць навуковую і выхаваўчую каштоўнасць.

78,8 мільёна рублёў такі эканамічны эфект толькі ад прамога ўкаранення ў вытворчасць вынікаў навуковых распрацовак. Асновай гэтага поспеху сталі фундаментальныя даследаванні, якія праведзены па ўсіх асноўных галінах ведаў. Вось толькі некаторыя з вынікаў.

Матэматыкі ў мінулым годзе знайшлі новыя метады даследавання некаторых задач лінейнага праграміравання. Фізікі атрымалі падрабязную інфармацыю аб рассейванні святла атмасферай. Фізіка-тэхнічным інстытутам на аснове развітай тэорыі фазавых і структурных пераўтварэнняў у сплавах распрацаваны і ўкаранёны метады электратэрмаапрацоўкі, якія даюць магчымасць у 3—4 разы паскорыць гэты працэс вытворчасці.

Разнастайныя па тэматыцы работы вучоных-біёлагаў, хімікаў. «Чырвоная кніга БССР рэдкіх і знікаючых відаў раслін і жывёл», упершыню ў Беларусі падрыхтаваная ў Інстытуце эксперыментальнай батанікі і аддзеле заалогіі і паразіталогіі, стане саліднай падмогай у справе аховы прыроды краю.

Быў адзначаны рост народнагаспадарчай аддачы навукі. Усяго ў мінулым годзе завершаны фундаментальныя даследаванні па 42 тэмах і выкананы 94 заданні па 31 важнейшай навукова-тэхнічнай праграме. У народную гаспадарку ўкаранёны 253 распрацоўкі.

Вучоныя АН БССР намецілі мерапрыемствы па паглыбленню і расшырэнню фундаментальных і прыкладных даследаванняў, канцэнтрацыі сіл на вырашэнні буйнамаштабных эканамічных і навукова-тэхнічных праблем. АН БССР, напрыклад, актыўна ўключылася ў распрацоўку рэспубліканскай комплекснай праграмы навукова-тэхнічнага прагрэсу і яе сацыяльна-эканамічных вынікаў на дваццацігадовы перыяд. Каардынацыйную работу па многіх праблемах праводзілі 48 навуковых саветаў акадэміі. Працавалі таксама 4 рэгіянальныя саветы, якія аб'ядналі намаганні вучоных Беларусі, Украіны, Малдавіі і прыбалтыйскіх рэспублік.

Значны ўклад акадэмічных інстытутаў у развіццё прадукцыйных сіл краіны. Гэта распрацоўкі Інстытута ядзернай энергетыкі, якія прынеслі дваццаць мільёнаў рублёў эканамічнага эфекту. Інстытут матэматыкі перадаў прамысловасці новыя праграмы для ЭВМ, якія далі толькі за год адзінаццаць мільёнаў рублёў эканоміі. Поўны эфект ад распрацовак Інстытута фізікі склаў 8,1 мільёна рублёў. На буйнейшых аўтамабільных і іншых заводах укаранёны новыя канструкцыйныя матэрыялы, атрыманыя ў Інстытуце механікі металапалімерных сістэм.

Акадэмія выкарыстоўвае розныя формы сувязі з вытворчасцю. Найбольш дзейсная з іх — выкананне работ на падставе гаспадарчых дагавораў з заказчыкам. Створаны аб'яднанні з удзелам акадэмічных інстытутаў. Так, пры аддзяленні фізіка-тэхнічных навук працуе аддзел праблемных даследаванняў грузавых аўтамабіляў аб'яднання «Белаўтамаз». Акадэмія ўзяла на сябе навуковае кіраўніцтва некаторымі заводскімі лабараторыямі. Усё гэта дазваляе значна павысіць колькасць і эканамічную эфектыўнасць укараняемых работ. У апошні час практыкуецца складанне комплексных планаў супрацоўніцтва акадэміі з міністэрствамі.

Перспектывы навуковых пошукаў звязваюцца з планамі развіцця народнай гаспадаркі краіны, павышэннем культуры, дабрабыту народа. Цяпер у нас узяты курс на прагрэс галін прамысловасці, якія вызначаюць тэмпы росту ўсяго эканамічнага патэнцыялу Беларусі. У першую чаргу гэта адносіцца да радыётэхнічнай, электроннай, станкабудаўнічай і станкаінструментальнай прамысловасці.

Характэрна, што навука дасягае ўсіх сфер практычнай дзейнасці. Са з'яўленнем ЭВМ важным звяном навукова-тэхнічнай рэвалюцыі стала матэматыка. Інстытуты фізічнага профілю працягваюць удзяляць увагу тым напрамкам, якія забяспечаць стварэнне элементаў ЭВМ на новых прынцыпах: квантавых генератарах, нелінейнай оптыцы і галаграфіі, аптычных метадах апрацоўкі інфармацыі і гэтак далей. Фізіка-тэхнічны інстытут працуе над стварэннем навуковых асноў працэсаў апрацоўкі матэрыялаў высокаканцэнтраванымі патокамі энергіі. Інстытут механікі металапалімерных сістэм расшырае тэарэтычныя і прыкладныя даследаванні, накіраваныя на атрыманне вырабаў з новымі якасцямі, якія здольны функцыяніраваць пры павышаных тэмпературах, у глыбокім вакууме.

(На гэтай жа старонцы змяшчаем інфармацыю аб найбольш значных дасягненнях вучоных Беларускай акадэміі навук у апошнія гады).

ЭФЕКТ ФЁДАРАВА

Адбіванне святла — адна з самых асноўных і прасцейшых аптычных з'яў, над якімі людзі задумваліся яшчэ ў даўнія часы. Сёння кожны школьнік ведае галоўныя заканамернасці гэтага працэсу, а іменна, што вугал падзення роўны вуглу адбіцця. Пры гэтым праменні, падаючы і ўзыходзячы, ляжаць у адной плоскасці з перпендыкулярам да адбіваючай паверхні цела.

На другую частку агульнавядомага закона зрабіў замах беларускі фізік лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР акадэмік АН БССР Фёдар Фёдараў. Выкарыстаўшы прынцыпова новы матэматычны падыход, ён упершыню пабудаваў тэорыю аптычных уласцівасцей празрыстых, паглынаючых, магнітных і гіратропных крышталяў, якая дазволіла прадказаць шэраг невядомых раней фізічных з'яў. Падобна славутаму французскаму астраному Левяр'е, які адкрыў планету «на кончыку алоўка», Фёдараў змог абстрактна выявіць новыя рысы ў такім, здавалася б, дасканальна вывучаным працэсе, як адбіццё святла.

Аказалася, што ў многіх выпадках, у прыватнасці пры адбіцці ад паглынаючага асяроддзя, прамень паводзіць сябе інакш, чым яму «прадпісвае» другая частка закона. У пункце падзення ён робіць рэзкі зігзаг у бок, як бы ідзе рыкашэтам, і толькі затым накіроўваецца пад вуглом, роўным вуглу падзення. Такім чынам прамень зведвае бакавое зрушэнне, якое ў сусветнай навуцы атрымала назву «зрух Фёдарава». Зрушэнне вельмі нязначнае па велічыні і вымяраецца тысячнымі долямі міліметра, тым не менш яно мае вялікае значэнне для навукі.

Французскі даследчык Крысціян Эмбер шляхам тонкіх доследаў пацвердзіў прадказанае Фёдаравым адхіленне адбітага промня. Цяпер гэты эфект інтэнсіўна вывучаюць у лабараторыях Францыі, ЗША, ФРГ і іншых краін.

ЛЮСТРЫ ПАЙШЛІ Ў АДСТАЎКУ

Нобелеўская прэмія 1964 года была прысуджана савецкім вучоным акадэмікам Мікалаю Басаву, Аляксандру Прохараву і амерыканскаму фізіку Ч. Таўнсу за стварэнне аптычнага цуда — лазера. Гэты цуд, прадказаны яшчэ ў 1917 годзе Альбертам Эйнштэйнам і прадугаданы доследамі маскоўскага фізіка-спектраскапіста В. Фабрыканта ў 1939 годзе, пастаўлены ў рад выдатных дасягненняў у гісторыі чалавечага розуму. Штучная сістэма, сэрцам якой быў рубінавы стрыжань або трубка з газам, незвычайным чынам узмацняла з дапамогай люстранога рэзанатара падаючае святло.

З таго часу рубін, газ і люстра сталі лічыцца абавязковымі кампанентамі любога аптычнага квантавага генератара. Але такому лазеру пры многіх вартасцях быў уласцівы адзін недахоп: работа на строга вызначаных частотах. Узнікла задача — знайсці актыўныя рэчывы, здольныя генерыраваць на розных па даўжыні хвалях. Яе вырашылі беларускія фізікі Барыс Сцяпанаў і Анатоль Рубінаў.

У 1964 годзе яны чыста тэарэтычна даказалі, што здольнасцю да пастаяннай генерацыі павінны валодаць... растворы фарбавальнікаў і іншых арганічных злучэнняў. Гэта быў такі нечаканы вывад, што многія не паверылі ў яго, пакуль эксперыменты не пацвердзілі наяўнасць новага перспектыўнага класа актыўных рэчываў.

Лазеры Барыса Сцяпанава і Анатоля Рубінава захоўвалі магутнасць выпраменьвання сваіх рубінавых папярэднікаў, але іх можна было настройваць на розныя частоты. Працягласць выпраменьвання таксама магла быць рознай — ад мільярдных долей секунды да няспыннага вылучэння. Адразу ўстарэла звычнае сцверджанне, што лазер «жыве» толькі на скразняку люстраў.

Створаны беларускімі вучонымі квантавы генератар працуе па прынцыпу так званай размеркаванай зваротнай сувязі. У ім няма дарагіх буйнагабарытных люстраў рэзанатара, і таму новы лазер просты, мініяцюрны, танны. Ён прыдатны для складаных эксперыментаў у фізіцы, медыцыне, біялогіі, для зандзіравання атмасферы і гэтак далей.

АДКРЫЦЦЁ АЛЯКСЕЯ ЛЫКАВА

Некалькі гадоў назад вялікі рэзананс у навуковым свеце выклікала адкрыццё беларускага вучонага Аляксея Лыкава. Ён першым вырашыў праблему цепла- і масаабмену, даў фізіка-матэматычнае апісанне з'явы, якая да гэтага часу заставалася незаўважанай.

Навізна ідэі Лыкава наглядна ўяўляецца на простым прыкладзе. Змяшчаючы ў агонь канец мокрага палена, вучоны ўсякі раз бачыў на другім канцы дрэва кроплі вільгаці і смалы. Назіранні прывялі Аляксея Лыкава да нечаканага выводу: у порыстым целе матэрыі пераносіцца не толькі цяпло, але і маса — у даным выпадку вада і смала. Яны перамяшчаюцца пад уплывам тэмпературы ад месц больш нагрэтых да халодных. Рознасць ціскаў, што ствараецца нагрэвам, выклікае рух.

Адначасова з адкрыццём гэтай уласцівасці матэрыі беларускі вучоны выказаў здагадку, што фронт выпарэння размяшчаецца не на бачнай паверхні цела, а некалькі глыбей, у прыгранічным слоі. Гіпотэза затым пацвердзілася сотнямі доследаў.

Веданне цепла- і масаабмену мае вялікае практычнае значэнне, паколькі гэтая з'ява суправаджае практычна ўсе працэсы ў прыродзе і тэхніцы. Цяпер, напрыклад, ва ўсім свеце інтэнсіўна даследуюцца ўласцівасці цеплавых труб, прыгодныя, як аказалася, для самых розных патрэб, ад прыгатавання бісквітаў да ахаладжэння лапатак турбін. Без уліку працэсаў цепла- і масаабмену немагчыма развіццё электронікі, станкабудавання, дарожнага будаўніцтва, харчовай прамысловасці, медыцыны...

У СССР галаўной установай, што вывучае цепла- і масаперанос, стаў Інстытут цепла- і масаабмену АН БССР, які цяпер носіць імя Аляксея Лыкава. На базе гэтага інстытута створаны Міжнародны цэнтр акадэмій сацыялістычных краін, дзе павышаюць сваю кваліфікацыю вучоныя, якія спецыялізуюцца на праблемах цепла- і масаабмену.

АРЭШАК, РАСКОЛАТЫ ЗНУТРЫ

У 1978 годзе 33-гадоваму беларускаму матэматыку Уладзіміру Платонаву было прысвоена званне лаўрэата Ленінскай прэміі. Ён рашыў задачу, якая сорак гадоў не паддавалася намаганням многіх вучоных свету. У выніку гэтага ўдалося выканаць цыкл работ у адной з самых складаных галін матэматыкі — тэорыі алгебраічных груп. Прапанаваныя ім метады памаглі даследаваць важныя пытанні алгебраічнай геаметрыі і тэорыі груп.

— Задача, аб якой ідзе гутарка, — гаворыць акадэмік Уладзімір Платонаў,— была пастаўлена ў 1942 годзе японскім матэматыкам Танакам і нямецкім вучоным Эмілем Арцінам. Яна ўзнікла на стыку сумежных галін матэматыкі, і яе рашэнне дапамагло б разгадаць тайны адразу некалькіх напрамкаў: тэорыі класічных груп, алгебры, алгебраічнай геаметрыі. Што можа быць больш прывабным для даследчыка? Але няўдача спасцігала ўсіх. Апошнім быў японскі матэматык, які аб'явіў аб станоўчым рашэнні задачы, але праз некалькі месяцаў сам выявіў памылку. Вось тады мне і прыйшла ідэя паспрабаваць рашыць гэтую «галаваломку» адмоўна, вобразна кажучы, раскалоць арэшак знутры. Гэта быў той самы ключ, якім я адкрыў так званую прыведзеную К-тэорыю, існаванне якой раней адмаўлялася.

Адкрыццё Уладзіміра Платонава выклікала нараджэнне цэлага напрамку айчыннай матэматыкі, які вывучаецца цяпер акадэмічным Інстытутам матэматыкі, што ўзначальваецца Платонавым.

Матэматыка сёння пранікла ў многія сферы чалавечай дзейнасці, з нараджэннем ЭВМ стала важным звяном навукова-тэхнічнай рэвалюцыі.

Фота Я. ПЯСЕЦКАГА.

Хутка прыляцяць шпакі.

пішуць землякі

БУДЗЬЦЕ ПІЛЬНЫМІ

Сёлета восенню мы з жонкай будзем адзначаць 50-годдзе нашага сумеснага жыцця. Марым у гэты час яшчэ раз паехаць на Радзіму. Але цяпер вельмі абвастрыліся адносіны паміж нашымі краінамі. Вы не можаце ўявіць сабе, якое цкаванне, лаянка і пагрозы абрушваюцца на вашу краіну тут, у ЗША.

Штодзённа друк, радыё, тэлебачанне ва ўсё горла крычаць аб «савецкай пагрозе», патрабуюць адпомсціць за, як яны называюць, «уварванне» СССР у Афганістан. Рэакцыянеры прыкладваюць усе сілы, каб байкатаваць Алімпійскія гульні ў Маскве, перапынілі ўсе гандлёвыя дагаворы аб закупках зерня, тэхнічнага абсталявання. Гэтыя меры распаўсюджваюцца і на культурны абмен паміж нашымі краінамі, нават забаранілі выстаўку шэдэўраў з Эрмітажа. Увогуле, усяго і не пералічыш. Але што выклікае нашу асаблівую трывогу, дык гэта тое, што ўрад ЗША тэрміновым парадкам наладжвае ваенныя сувязі з Пакістанам, Турцыяй, Кітаем. Як відаць, усё гэта можа пагражаць нам новай вайной. Нам, эмігрантам з Расіі, асабліва цяжка гэта перажываць.

А вам усім у Савецкім Саюзе трэба быць асабліва пільнымі і цвёрда процістаяць новым спробам імперыялістаў развязаць вайну. Мы тут упэўнены, што вы, як заўсёды, будзеце ў авангардзе барацьбітоў за мір на зямлі.

Яўгенія і Рыгор МЕХАВЫ.

ЗША.

ВЕРИМ В БЛАГОРАЗУМИЕ ЛЮДЕЙ

Прошло уже довольно много времени со дня, когда наша Родина подала руку братской помощи афганскому народу для защиты народной революции. Как видно по злобным высказываниям империалистической прессы, этим шагом ваша страна расстроила все инструменты подготовленного американскими и китайскими дирижерами международного контрреволюционного концерта, который так усердно и долго репетировался, чтобы сыграть быстро и точно и задушить афганскую революцию в колыбели. Вот отчего у нас радио, телевидение, газеты и журналы переполнены сообщениями о мнимых ужасах, творимых в Афганистане «русскими безбожниками».

Здесь, в Канаде, впереди всех в этом прислужническом спорте шествовал бывший премьер Кларк со своей консервативной партией. Они первые выразили стопроцентную поддержку Джимми Картеру в его «христианском противостоянии атеистам Кремля». И кому же наше правительство оказывало поддержку? Американскому империализму, руки которого обагрены кровью вьетнамского, лаосского, кампучийского, никарагуанского, чилийского, иранского и многих других народов, борющихся за свою независимость. В том, что такая борьба идет и ничего с этим поделать нельзя, также обвиняют Советский Союз. Ничего удивительного, ведь сегодня империалисты обвиняют нашу Родину во всех своих грехах. Здесь часто можно слышать, что если бы, мол, не Советы, то нефть по-прежнему стоила бы полтора—два доллара за бочку, а не 35, как сейчас тянет из нас ОПЭК. Не было бы у нас никакой инфляции, безработица отошла бы в небытие, и живи себе, наслаждайся экзотической пищей и блеском золота, которое по тем же причинам стало почти недоступным даже высшему классу нашего общества. Где же всё-таки истинная причина этих несчастий? Об этом здесь не говорит ни одна партия, кроме коммунистической. Сегодня все видят, что народы мира по воле империалистических сил оказались на распутье. Одна дорога, по которой бежит президент США и зовет за собой всех своих прислужников, ведет к катастрофе, невиданным разрушениям, уничтожению жизни на нашей планете. Другая, единственно приемлемая для человечества дорога, прокладывается Советским Союзом. На протяжении всей своей истории наша Родине твердо и последовательно идет в авангарде борцов за мир во всем мире.

От того, по какой дороге пойдет большинство народов, зависит судьба всего человечества. Хочется верить, что благоразумие людей победит новоявленных мракобесов.

Надежда и Григорий МАРТЫНЮКИ.

Канада.

МУЗЫКАНТ

Рэпетыцыя Целяханскага народнага тэатра зацягнулася да паўночы. А ён не спяшаўся ісці дадому. Чалавек быў у кірзавых ботах, чорнай фуфайцы, з густой сівой шчацінай на твары. Я прыняў яго за вартаўніка. Але вось закончылася, нарэшце, рэпетыцыя. Самадзейныя артысты стомлена сышлі са сцэны. Тады чалавек узяў са стала мандаліну, ласкава пагладзіў яе і пачаў настройваць. Усе, хто быў побач, ажывіліся.

— Мікалаевіч, што-небудзь для душы, — папрасілі дзяўчаты.

Чалавек сціпла ўсміхнуўся і раптам па-заліхвацку ўдарыў медыятарам па струнах. Радаснай птушкай вырвалася з-пад рук вечна маладая мелодыя полькі. Страпянулася і часта-часта застукала сэрца, павеяла нечым вельмі знаёмым, родным. Светлай радасцю засвяціліся ў людзей твары. І дзяўчына, што сядзела наперадзе мяне, не ўтрымалася. Топнула боцікамі, падхапіла пад руку сяброўку, і пайшлі кружыць, час ад часу гарэзліва выкрыкваючы: «І-і-іх!»

А музыкант падсыпаў і падсыпаў ім пад ногі свавольную мелодыю танца...

У той вечар мы і пазнаёміліся.

Аказваецца, Міхась Крынец зусім ніякі не вартаўнік. А падоўгу затрымліваецца ў Палацы культуры таму, што ўсё жыццё ён быў культработнікам. З пасады мастацкага кіраўніка пайшоў на пенсію, але зусім расстацца з клубнай справай не можа. Па-ранейшаму іграе, кіруе аркестрам народных інструментаў.

У народзе іншы раз сустракаюцца вось такія самародкі. Мастакі, спевакі, музыканты... Па розных абставінах не змаглі яны закончыць спецыяльныя навучальныя ўстановы. Але сёння дзяржава дала ім усе магчымасці займацца любімай справай. І яны, дзякуючы сваім незвычайным здольнасцям і вялікай, да самазабыцця любві да мастацтва, дабіліся яркага майстэрства. Вось і Крынец з такіх.

Імперыялістычная вайна, сіроцтва, бежанства ўглыб Расіі, бясхлеб'е, дзіцячы дом — вось што выпала на раннія гады яго жыцця. І потым, калі яны з маці вярнуліся ў родныя Целяханы, жыццё не стала лепшым. У Заходняй Беларусі гаспадарылі польскія памешчыкі. Адукацыяй працоўных яны не песцілі, хлебам — таксама. І чытаць, і іграць вучыўся сам па сабе. Калі здаралася вольная мінута, хлопец шукаў зацішны куток, дзе пазнаваў таямніцу літар і гукаў. Цэлыя ночы праводзіў з трубой або кнігай.

— І тады, і пазней, — расказваў М. Крынец, — пастаянна адчуваў нейкую душэўную цягу да ігры. Калі мне трапляў у рукі інструмент, на якім не ўмеў граць, я губляў сон і апетыт. Я павінен быў, чаго б гэта ні каштавала, авалодаць ім. Праўда, музычныя інструменты ў нашай вёсцы сустракаліся не часта.

Пасля Вялікай Айчыннай вайны музыкант вярнуўся ў роднае сяло і зноў узяўся за любімую справу.

— Які гэта быў час!.. — калматыя бровы Крынца папаўзлі ўгору. — Гэта сёння ў нас Палац культуры — гараджане пазайздросцяць. А тады ж клуб мясціўся ў старой хаце, не хапала музычных інструментаў... Затое было ў дастатку энтузіязму, гарачай любві да самадзейнай сцэны. Мы рыхтавалі спектаклі, канцэрты, а потым пеша, у лепшым выпадку на падводзе дабіраліся ў суседнія вёскі, дзе паказвалі сваё майстэрства. Цяжкасці абарачваліся радасцю. А колькі мы прайшлі дарог з цяпер народным артыстам СССР Генадзем Цітовічам, збіраючы багацці народнай творчасці!..

Міхась Крынец быў адным са стваральнікаў драматычнага гуртка, які вырас у народны тэатр. Пазней ён арганізаваў аркестр народных інструментаў. Сёння ў гэтым аркестры іграюць 18 чалавек. Калектыў прымаў удзел у першым Усесаюзным фестывалі самадзейнай творчасці працоўных. За сваё майстэрства ўдастоены дыплома.

Для многіх музыкантаў аркестр быў не толькі месцам, дзе яны шліфавалі здольнасці, майстэрства, але і мосцікам у прафесію. Аляксандр Жыцянёў, Віктар Курачкін і іншыя ўдзельнікі аркестра нядаўна закончылі музычныя вучылішчы.

Музычныя здольнасці атрымалі ў спадчыну ад Крынца яго дзеці. У Міхася іх шасцёра — тры дачкі і тры сыны. Дочкі закончылі спецыяльныя вучылішчы і працуюць выкладчыкамі ў школах. Сыны выбралі іншыя прафесіі, але кожны з іх таксама грае.

Ёсць у Крынцоў добрая традыцыя: летам збірацца разам. З жонкамі і дзецьмі прыязджаюць яны ў родную вёску Целяханы Івацэвіцкага раёна. Цесна становіцца тады ў прасторным доме Міхася Мікалаевіча. Цесна, але радасна, весела. Асабліва, калі ўсе возьмуць у рукі музычныя інструменты. Якім шчаслівым і багатым адчувае сябе ў такія мінуты Міхась Крынец! І яго бацька, і як музыкант...

Артур ЦЯЖКІ.

ИЗ МИНСКА—С КНИГАМИ...

ТРАДИЦИИ СЕМЬИ КОЛЬМ

Когда Петра и Дитмар Кольм садились в скорый поезд «Москва—Берлин», друзья, провожавшие молодоженов, выпускников Белорусского политехнического института, шутили: «Ну и приданое! У себя в Магдебурге можете филиал БПИ открыть».

Немудреные студенческие пожитки молодой семьи терялись среди связок книг и конспектов. По названиям на корешках — «Справочник конструктора-машиностроителя», «Теоретическая механика», «Электрические машины» нетрудно было догадаться и о профессиях вчерашних студентов. Книги со словами «энергетика» и «электричество» принадлежали Петре, ну а «богатства» Дитмара выдавали в их хозяине инженера-машиностроителя.

Я вспомнил этот эпизод с книгами, когда совсем недавно встретился с уже, можно сказать, опытными специалистами, супругами Кольм, приехавшими через три года в свою «альма матер» — Белорусский политехнический институт в качестве гостей немецкого землячества. Студенты из ГДР сыпали вопросы землякам-инженерам: после трехлетней работы на производстве многое в учебе приобретает новые оттенки, лучше понимаешь, что упустил.

Петра и Дитмар начинали учиться в крупнейшем вузе республики в числе девятисот своих сверстников, посланцев 69 стран мира. Петра мечтала строить атомные станции, но закончила факультет промышленной энергетики по специальности электроснабжение предприятий, городов и сельского хозяйства, что, в общем-то, не менее важно, чем проектирование АЭС. Мечта Дитмара стала теперь его повседневным делом. Сын рабочего одного из народных предприятий Карл-Маркс-Штадта, он уже к моменту отъезда на учебу в Советский Союз в графе о профессии записал «слесарь». Годы учебы на машиностроительном факультете БПИ, практика на крупнейших предприятиях Минска, таких, например, как станкостроительный завод имени Октябрьской революции, позволили определить будущему специалисту: выбор верен.

Сейчас Дитмар конструирует узлы токарных станков, изготавливаемых фабрикой имени Германа Митерна, деятеля немецкого рабочего движения, для предприятий ГДР и стран социалистического содружества. Один тип станков с узлом, созданным конструктором Кольмом, уже работает на заводах СССР, в том числе и на предприятиях Минска.

Технические справочники и книги на русском языке в домашней библиотеке семьи Кольм не пылятся. Когда я поинтересовался у молодых специалистов, что было самым трудным в начале их трудовой биографии, то услышал, на первый взгляд, странный ответ: перевод с русского на немецкий. Дело в том, что за время учебы и Петра, и Дитмар привыкли пользоваться русскими техническими терминами, а немецкие названия тех или иных узлов и деталей им пришлось, по сути, учить заново.

— Если бы я сейчас вернулся на несколько лет назад, — рассказывает Дитмар, — то в учебе больше внимания уделил бы электротехнике. Я как раз специализируюсь в этом направлении. Правда, конспект лекций выручает, да и справочники. Везти домой было тяжело, зато сейчас легко с их помощью решать сложные производственные задачи.

— Вспоминая учебу, только теперь по-настоящему оценила, что дала мне производственная практика. Здесь на деле видишь результаты расчетов и теоретических выкладок, записанных в конспектах, — добавила Петра. — Практика, пройденная на белорусских предприятиях, помогла мне быстрее адаптироваться, когда я стала работать в системе электроснабжения Магдебурга. Ведь в Минске я детально ознакомилась с производством энергии на ТЭЦ-2 и электроснабжением такого большого завода, как тракторный...

Выбор профессии... Правильность его проверяется годами работы. А уверенность в том, что ты сделал единственно верный выбор, укрепляется с годами.

Мы шли по Ленинскому проспекту, вспоминали студенческое житье-бытье.

«Зайдем», — предложил я Дитмару и Петре, кивнув на фасад дома, где над стеклянными витринами высветилась неоновая надпись «Научно-техническая книга».

— Опять налегке уезжать не придется, — рассмеялись мои друзья, а Дитмар добавил:

— По-моему, это уже традиция, а традицию, как известно, надо поддерживать.

А. ПАЛЬЧЕВСКИЙ.

КЛИМАТ НА ПОРОГЕ БУДУЩЕГО ТЫСЯЧЕЛЕТИЯ

Тема климата не сходит со страниц газет мира, она пестрит самыми противоречивыми предсказаниями: от нового ледникового периода и «всемирного потопа» до превращения поверхности планеты в пустыню.

Что же, в сущности, происходит с климатом? На этот вопрос отвечает первый заместитель председателя Государственного комитета по гидрометеорологии и контролю природной среды профессор Юрий СЕДУНОВ.

Климат, как и любое природное явление, не остается постоянным, а испытывает резкие колебания.

В конце шестидесятых годов в Сахельской зоне Африки жестокая засуха привела к большим потерям урожая и многочисленным человеческим жертвам. Запаздывание муссонов в Индии в 1974 году сократило производство продовольствия, волны холода в Бразилии в 1975 году нанесли ущерб кофейным плантациям и т. д.

Благосостояние человечества весьма чувствительно к климатическим изменениям, особенно сильно эта зависимость проявляется в обеспечении населения продовольствием. Есть еще один немаловажный факт, который вызывает озабоченность мировой научной общественности в связи с возможными изменениями климата. Исследования показывают, что мы вступаем в эру, когда хозяйственная деятельность человека уже существенно влияет на климат. Человек изменяет радиационные свойства атмосферы, ее циркуляцию, выбрасывая в нее отходы промышленности и сельского хозяйства, вырубает леса, распахивает новые земли, перераспределяет водные ресурсы.

Эти обстоятельства диктуют необходимость рассмотреть развитие человеческого общества на земле сквозь призму климата. Именно поэтому такое большое внимание уделяет Всемирная метеорологическая организация (ВМО) разработке Всемирной климатической программы. В рамках этой программы ученые будут изучать сложные экологические системы, химию атмосферы и вод океана, процессы в верхних слоях атмосферы и на Солнце, геофизическую и геологическую структуру Земли и морского дна. Современные наблюдения за климатом начались только в прошлом столетии. Они показывают, что средние температуры приземного слоя воздуха возрастали с 1880 года примерно до 1938 года,затем отмечалось падение температуры, после чего она опять стала повышаться во второй половине 60-х годов. Ряд специалистов считают, что изменчивость температуры возрастает, однако имеющиеся данные очень противоречивы.

Известно, что на погоду существенно влияет распределение солнечного тепла по земной поверхности. В свою очередь, количество солнечной энергии, достигающей поверхности Земли, зависит от прозрачности ее атмосферы. Кроме того, земная поверхность нагревается и в процессе хозяйственной деятельности человека. Попадание фотохимических активных веществ в стратосферу может вызвать нарушение «озонного» слоя, играющего важную роль в защите биосферы от действия ультрафиолетового излучения солнца. Такое же воздействие могут оказать окислы азота, хлорфторуглероды и некоторые другие газы. Кроме того, накопление в атмосфере углекислого газа может создать «тепличный эффект», в результате которого солнечные лучи будут проходить к Земле, а поднимающееся с ее поверхности тепло — задерживаться. Концентрация углекислого газа в течение последнего столетия возросла приблизительно на 15 процентов и продолжает расти со скоростью 0,3—0,4 процента в год. Тенденция роста этого газа будет сохраняться до тех пор, пока выработка энергии за счет ископаемого топлива не будет заменена выработкой ядерной и солнечной энергии. По оценке экспертов, на это потребуется, по крайней мере, 50 лет.

Безусловно, изучение климата прошлого дает огромную информацию, необходимую для предсказаний климата будущего, но этого недостаточно. Ни климат прошлого, ни его особенности сейчас не позволяют делать определенных выводов. В колебаниях климата пока не обнаружено четких статистических закономерностей, его поведение слишком сложно. Климат нужно изучать, устраняя имеющиеся неопределенности в физических закономерностях, исследуя сложнейшие процессы, работая над построением модели климата. В этом описании должны быть представлены процессы, происходящие в атмосфере, гидросфере, криосфере и биосфере. Каким будет климат на пороге будущего тысячелетия? Ясно одно: климат меняется и будет продолжать изменяться естественным образом. В Северном полушарии в течение последних десятилетий холодает. Будет ли протекать этот процесс в будущем, пока неизвестно. Тем не менее с определенностью можно сказать, что рост углекислого газа может вызвать потепление нижней части атмосферы, особенно в высоких широтах. Другие виды деятельности человека, такие как сельское хозяйство, производство энергии, могут привести к изменениям состава атмосферы, ее температурного режима. В этой связи Всемирная климатическая программа заслуживает самой серьезной поддержки со стороны всех стран. Основные ее направления включают исследования механизмов естественного и антропогенного изменения климата, улучшения системы сбора метеорологических, гидрологических, океанографических и других необходимых геофизических данных, которые помогут решить эту планетарную задачу.

НА КІРМАШЫ Ў ЛЕЙПЦЫГУ

Карэспандэнт ТАСС перадаў з Лейпцыга:

Калі будынак павільёна СССР на міжнародным веснавым кірмашы выдзяляецца візуальна архітэктурай, імкліва ўзлятаючым у неба залатым шпілем, то стэнды Савецкай Беларусі ў гэтым велізарным будынку, які займае плошчу футбольнага поля, можна знайсці на слых: запісаная на магнітафонную плёнку трэль салаўя ветліва сустракае наведвальнікаў. У гэтым годзе БССР прадстаўляе тут савецкія рэспублікі. Ужо за першыя суткі беларускую экспазіцыю агледзелі дзесяткі тысяч людзей.

Шчыльны натоўп людзей пастаянна, нібы магніт, прыцягвае да сябе стэнд, які дэманструе прадукцыю дывановых камбінатаў Віцебска і Брэста.

Ля процілеглай сцяны залы, пабліскваючы свежай фарбай, стаяць станкі. Увагу экспарцёраў прыцягвае вертыкальна-працяжны станок з аўтаматычнай зменай інструментаў, які поўнасцю адпавядае сусветным стандартам. Ён выпускаецца на Мінскім станкабудаўнічым заводзе імя С. Кірава.

Вось прыбор, які нагадвае павялічаны ў памерах мікраскоп. Гэта ўстаноўка, якая дае магчымасць атрымліваць з дроту вельмі тонкія ніці мікронных сячэнняў, неабходныя пры вырабе звышдакладных вымяральных прыбораў. Уявіце сабе своеасаблівую «кузню», дзе ролю «молата» адыгрывае ультрагук. Прыбор запатэнтаваны ў ЗША, Англіі, Францыі.

Генеральны сакратар ЦК САПГ, Старшыня Дзяржаўнага савета ГДР Э. Хонекер, наведаўшы выстаўку, заявіў: «Агляд дасягненняў БССР даставіў нам многа радасці. Перад намі — нагляднае сведчанне высокага ўзроўню развіцця народнай гаспадаркі рэспублікі».

В. ІВАНОЎ.

Плошча У. І. Леніна — галоўная ў Вілейцы. Тут праходзяць урачыстыя сходы працоўных і народныя гулянні.

Фота У. СІЗА.

СОВЕТСКИЕ ЦЫГАНЕ: ПИСАТЕЛИ, ИСТОРИКИ, БИОЛОГИ...

Сами цыгане, называющие себя «рома», т. е. люди, в отличие от всех остальных «гайо», по-разному рассказывают о происхождении своих предков. Большинство историков и этнографов, в том числе и советских, считают, что родиной цыган является Индия, которую они покинули в конце первого тысячелетия нашей эры...

В СССР около двухсот тысяч цыган. Какие перемены произошли в жизни этих, прежде традиционно нищих кочевников?

Вот лишь несколько штрихов к их «коллективному портрету».

«БАХТ» И «БИБАХТ»

— Наши деды знали только, что такое «бибахт» (несчастье), а мы теперь знаем, что на земле есть и «бахт» (счастье),—так говорил мне 45-летний цыган Иван Горбунов, житель села Тростань Брянской области. Долгие годы Горбунов кочевал вместе с другими цыганами, но однажды, когда табор остановился в Тростани, сказал, что дальше не пойдет. «Я понял, что пришло время сделать выбор. Я хотел, чтобы мои дети учились, как все. И сказал: пора сломать кнут...».

Желание получить постоянную профессию, стремление дать детям образование—вот, пожалуй, основные причины, которые заставляют немногих еще кочующих цыган переходить к оседлому образу жизни. Кстати, в некоторых школах Советского Союза открыты специальные классы, где обучение ведется на русском и цыганском языках.

Но вернемся к Горбуновым. Как сложилась их жизнь на новом месте? Сельский Совет предоставил им приусадебный участок, банк выдал долгосрочную ссуду на строительство дома. Самому Ивану помогли приобрести профессию шофера. Что же касается его детей—Василия и Татьяны, то они успешно окончили школу вместе со своими сверстниками и теперь работают в местном колхозе. Новая жизнь принесла Ивану, как он говорит, «бахт»...

КНИГИ ЦЫГАНСКИХ ПИСАТЕЛЕЙ

В городе Орле (Центр России) на одной из улиц стоит небольшой особняк. В нем расположился музей, рассказывающий о писателях—местных уроженцах. Здесь представлены материалы о жизни и творчестве Ивана Тургенева и Николая Лескова, Ивана Бунина и Леонида Андреева, Михаила Пришвина и... Александра Германо. Многим незнакома эта последняя фамилия, однако именно Германо считают основоположником цыганской литературы.

Он написал много рассказов, очерков, статей о жизни цыган. Один из очерков был высоко оценен Максимом Горьким. В 1931 году, когда в Москве открылся единственный в мире профессиональный цыганский театр «Ромэн», первым спектаклем на его сцене стала пьеса Германо «Жизнь на колесах» (она ставилась более 1200 раз). После смерти Германо (1955 год) его произведения дважды выходили 30-тысячными тиражами и мгновенно раскупались.

Советскими писателями-цыганами создано более 600 книг. Они отобразили жизненный уклад своего народа, его прошлое и настоящее. Они писали и пишут о том, что хорошо знают: ведь многие, особенно представители старшего поколения, прошли тяжелую жизненную школу кочевников. Так, долгие годы кочевал с табором Михаил Безлюдский. Его первая книга «Пейко ко пейко» («Плечом к плечу») посвящена созданию сельскохозяйственного кооператива цыган. Факты почерпнуты Безлюдским из реальной жизни: несколько лет он возглавлял колхоз «Труд Ромэн» («Труд цыган»).

В 1974 году в издательстве «Советская Россия» вышел поэтический сборник «Костры», в который включены произведения девяти авторов-цыган. Читатели получили возможность познакомиться с творчеством молодых поэтов Карло Рудевича, Ильи Мазуро, Ивана Романо и других.

Много внимания писатели-цыгане уделяют переводам лучших произведений мировой литературы на родной язык. Любопытно, что одной из первых была переведена поэма Александра Пушкина «Цыганы». Перевел ее поэт и прозаик цыган Николай Панков.

На сценах театров СССР постоянно идут пьесы, написанные драматургами-цыганами. По традиции право первой постановки они предоставляют своему театру «Ромэн».

НАУКУ О ЦЫГАНАХ «ДЕЛАЮТ» САМИ ЦЫГАНЕ

В Советском Союзе никого не удивляет, что из неграмотных цыган выросла плеяда интеллигентов, работающих в самых различных отраслях. Представлены цыгане и в советской науке.

Так, Татьяна Киселева — кандидат исторических наук, автор интересного исследования «Цыгане европейской части СССР и их переход от кочевья к оседлости». Кандидат биологических наук Любовь Панкова занимается проблемами мозга. Инга Андронникова изучает историю и искусство цыганского народа. В ее архиве уже несколько тысяч пословиц, свыше 500 записанных песен, около 100 сказок (часть из них была опубликована в книге «Сказки идущих за солнцем»).

Я спросил у выпускницы исторического факультета Московского университета, а ныне научного сотрудника Института этнографии АН СССР Надежды Деметр, над чем она работает. «Над темой о старинных цыганских обычаях и обрядах. Нужно спешить, пока они не превратились в легенду, которая будет начинаться со знакомых слов, слышанных мною от моего дедушки: «Не помню уж, когда это точно было...». Кстати, в 1979 году вышла первая научная работа Деметр «Некоторые черты семейного быта цыган калдорари».

...Как и тысячи других современных цыган, Надежда Деметр родилась не в кочевой кибитке, а в родильном доме. И о таборе знает только по рассказам старших. Но она осталась цыганкой. Об этом лучше всего свидетельствуют песни под гитару, которые часто звучат в ее доме. И без табора цыган остается цыганом, а без песни и гитары — нет...

Илья ГИТЛИЦ.
(АПН).

СССР АКАЗВАЕ ДАПАМОГУ МНОГІМ КРАІНАМ АЗІІ Ў РАЗВІЦЦІ НАЦЫЯНАЛЬНАГА МАСТАЦТВА

ПАШЫРАЕЦЦА АБМЕН

Нават моцная паводка не змагла перашкодзіць спектаклю савецкіх артыстаў у Сінгапуры ў час гастроляў Тэатра оперы і балета імя Айні Таджыкскай ССР (адной з 15 саюзных рэспублік СССР), ніводзін з 3,5 тысячы чалавек не пакінуў перапоўненай залы. Некалькі гадоў назад у Дэлі і Бамбеі немагчыма было дастаць білеты на прадстаўленні Ташкенцкага тэатра лялек (Узбекістан). Нядаўна закончыліся гастролі ленінградскага ансамбля «Харэаграфічныя мініяцюры» ў Індыі, Малайзіі, Тайландзе, Сінгапуры, Філіпінах. Гэтыя нешматлікія факты гавораць аб усё большай увазе ў краінах азіяцкага кантынента да савецкай культуры.

Актывізацыя культурнага супрацоўніцтва СССР з краінамі азіяцкага кантынента выяўляецца перш за ўсё ва ўстанаўленні, развіцці і ўмацаванні міждзяржаўных двухбаковых кантактаў у розных сферах культуры. Такое супрацоўніцтва набывае форму міжурадавых пагадненняў, што стварае найбольш спрыяльныя ўмовы для расшырэння культурных сувязей.

Формы культурнага супрацоўніцтва самыя розныя. Усё часцей праводзяцца ўзаемныя фестывалі, дэкады, Дні культуры, у якіх прымаюць удзел майстры музычнага, танцавальнага, тэатральнага мастацтва, літаратуры, кіно. Так, у апошні час у рамках двухбаковага культурнага супрацоўніцтва прайшлі фестывалі савецкай культуры ў Індыі і індыйскага мастацтва ў Савецкім Саюзе, Дні культуры СССР у Непале, Шры Ланка, Сінгапуры, Малайзіі.

Паўнакроўнае развіццё атрымлівае і непасрэднае супрацоўніцтва паміж установамі культуры, калектывамі мастацтва, музеямі. Напрыклад, у 1978 годзе для сумеснага навуковага вывучэння помнікаў афганскай культуры былі ўстаноўлены прамыя сувязі паміж Музеем мастацтва народаў Усходу ў Маскве і Кабульскім нацыянальным музеем.

Становіцца ўсё больш інтэнсіўным і плённым абмен бібліятэчнымі і музейнымі работнікамі, часцей экспануюцца творы жывапісу, скульптуры, графікі і вырабы дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва. Толькі за два апошнія гады ў краінах Азіі прайшлі такія выстаўкі, як «Мастацкія промыслы савецкіх рэспублік Прыбалтыкі» ў Індыі і Непале, савецкай графікі і эстампа ў Тайландзе, «Пейзаж маёй Радзімы» ў Бірме, Шры Ланка, Бангладэш. А ў СССР з вялікім поспехам экспанаваліся выстаўкі «Мастацтва Непала», батыка Інданезіі і Малайзіі, «Сучаснае мастацтва Сінгапура», выстаўка жывапісу сучасных турэцкіх мастакоў і іншыя.

Сведчаннем вялікай павагі, якую адчуваюць адзін да аднаго народы СССР і краін Азіі, стала добрая традыцыя — абмен дарамі, што ўзбагачаюць музейныя калекцыі. Прыкладам гэтай новай формы супрацоўніцтва могуць служыць узаемаадносіны Індыі і СССР. Многія савецкія мастакі паднеслі ў дар Індыі прысвечаныя ёй карціны, скульптуры, графіку. У 1977 годзе індыйская мастачка Рэкха Чакрдборці падарыла СССР мастацкую вышыўку гладдзю.

Гастролі савецкіх тэатраў, мастацкія выстаўкі, канцэрты майстроў мастацтваў, як правіла, выклікаюць вялікую цікавасць у грамадскасці краін Азіі. Яны шырока асвятляюцца на старонках газет, у перадачах радыё па тэлебачанні.

СССР аказвае дапамогу многім краінам Азіі ў развіцці нацыянальнага мастацтва, у падрыхтоўцы кадраў майстроў мастацтваў. У савецкіх вышэйшых навучальных установах, кансерваторыях вучацца студэнты з краін Азіі — будучыя музыканты, майстры тэатра і кіно. Савецкія спецыялісты выязджаюць у краіны Азіі, дзе працуюць, скажам, у Інстытуце мастацтваў Адэна (НДРЙ), тэатры оперы і балета Анкары (Турцыя), Дамаскай кансерваторыі (Сірыя).

У такіх краінах, як Індыя, Шры Ланка, Непал, склалася спрыяльнае становішча для далейшага развіцця і ўмацавання супрацоўніцтва ў галіне культуры.

Характэрным прыкладам узаемаўзбагачаючага супрацоўніцтва СССР з краінамі Азіі ў галіне культуры можна лічыць супрацоўніцтва з Рэспублікай Філіпіны. Хоць прайшло толькі чатыры гады з часу ўстанаўлення дыпламатычных адносін паміж СССР і Рэспублікай Філіпіны, тут ужо дэманстравалася выстаўка рускага і савецкага жывапісу, аб якой падрабязна пісала прэса Філіпін, з вялікім поспехам прайшлі гастролі ленінградскага ансамбля «Харэаграфічныя мініяцюры». У сваю чаргу ў СССР пабывалі прадстаўнікі мастацтва Філіпін — ансамбль танца «Баяніхан» і балетная трупа, якой кіруе папулярная балерына і харэограф Аліса Рэес. «Мы былі літаральна ўражаны ўвагай да нас, — заявіла яна. — З першых жа крокаў на вашай зямлі нас акружала дружалюбнасць, сардэчнасць, гасціннасць».

Прыклад Філіпін, як і супрацоўніцтва Савецкага Саюза з іншымі краінамі Азіі ў галіне культуры і мастацтва, сведчыць аб тым, што культурныя сувязі па меры іх расшырэння дапамагаюць устанаўленню адносін узаемнага давер'я і добразычлівасці.

Юрый КУЗНЯЦОЎ,
начальнік аддзела Азіі і Афрыкі Міністэрства культуры СССР.



Новы гісторыка-краязнаўчы музей — восьмы па ліку ў Гродзкай вобласці — адкрыўся ў гарадскім пасёлку Свіслач. Экспазіцыя расказвае аб мінулым краю, удзеле мясцовых жыхароў у рэвалюцыйным і вызваленчым руху, аб дасягненнях у развіцці народнай гаспадаркі і культуры, аб прыродзе.
НА ЗДЫМКУ: экскурсію вучняў вядзе супрацоўнік музея Л. БЛІЗНЮК.

Фота А. ПЕРАХОДА.

ВІЗІТНАЯ КАРТКА РЭСПУБЛІКІ

Намеснік старшыні Дзяржкамітэта БССР па справах выдавецтваў, паліграфіі і кніжнага гандлю Анатоль БАРУШКА расказвае пра выданні, прымеркаваныя да Алімпіяды-80.

Перадалімпійскімі клопатамі жывуць нашы выдавецтвы «Беларусь», «Полымя», «Вышэйшая школа». Мы імкнёмся, каб госці Беларусі сваімі вачыма ўбачылі, якіх вышынь дасягнулі працоўныя рэспублікі. У гэтым ім дапамогуць прыгожыя альбомы «Савецкая Беларусь», «Бераг белых буслоў» і іншыя выданні, прымеркаваныя да Алімпіяды-80. Заўважым, што большасць з іх выпускаецца на беларускай, рускай і асноўных замежных мовах.

Запрашаючы гасцей да падарожжа па нашай рэспубліцы, пісьменнік Уладзімір Караткевіч у кнізе «Памяць зямлі беларускай» звяртаецца да іх, у прыватнасці, з наступнымі словамі: «Я хачу правесці Вас па зямлі, якая для мяне — і, мабыць, не толькі для мяне — даражэй за ўсё, самы ўтульны і чароўны кут... Гэта ў мінулым шматпакутная і гераічная зямля. Безліч разоў грукаталі па ёй калясніцы вайны. Але мы, дзеці Беларусі, ганарымся тым, што ў гэтых войнах яна ніколі, запамятайце гэта, ніколі не была агрэсарам. Іншая справа, што яна заўсёды мужна і да канца бараніла свой ачаг, сваю праўду і веру».

Выпускаюцца сёлета буклеты пра нашы мемарыяльныя комплексы, што ўвекавечылі бессмяротны подзвіг савецкіх людзей у гады Вялікай Айчыннай вайны.

Спецыяльнае выданне раскажа аб калекцыі жывапісу, скульптуры, графікі, дэкаратыўна-прыкладнога і тэатральна-дэкаратыўнага мастацтва, сабранай у Дзяржаўным мастацкім музеі БССР. Музей—самы буйны збор твораў выяўленчага і прыкладнога мастацтва ў нашай рэспубліцы, добра вядомы сёння ў культурным свеце. Гісторыя яго стварэння цэ[illegible] звязана з перамогай Вя[illegible] га Кастрычніка, з ажыццяў[illegible] нем ленінскай нацыянал[illegible] палітыкі. Альбом «Белар[illegible] савецкі жывапіс» знаёміц[illegible] творчасцю сучасных ма[illegible] коў.

Спецыяльна для ўдзе[illegible] каў Алімпійскіх гульняў і [illegible] межных гасцей на пяці [illegible] вах выпускаецца шэсць [illegible] шур з каляровымі ілюстра[illegible] мі. Гэта «Савецкая Белар[illegible] «Як жывуць у Беларусі», «[illegible] номіка Беларускай [illegible] «Культура, навука і адука[illegible] ў БССР», «Моладзь Саве[illegible] Беларусі», «Фізкультура і с[illegible] у БССР».

Нашым алімпійскім «[illegible] шынцам» з'яўляецца каля[illegible] «Беларусь спартыўная». [illegible] знаёміць са спартыўнымі ко[illegible] лексамі і збудаваннямі рэс[illegible] лікі, расказвае пра белар[illegible] атлетаў — чэмпіёнаў Алімп[illegible] свету і Еўропы. Выйшаў да[illegible] нік «Мінск спартыўны», ад[illegible] чаны дыпломам аргкам[illegible] Алімпіяды-80. Рыхтуюцца [illegible] веднікі, якія дапамогуць [illegible] ентавацца турыстам у [illegible] алімпійскага футбольнага [illegible] ніру ў Мінску, напрык[illegible] «Падарожжа па Беларусі», [illegible] стане прыемным сувенірам [illegible] для гасцей, так і для гаспа[illegible] роў.

Заканчваецца выпуск аль[illegible] маў з алімпійскай сімволі[illegible] «Беларусь спартыўная». Пр[illegible] гожым будзе выданне «М[illegible] скі стадыён «Дынама». Шэ[illegible] ілюстраваных кніг прысве[illegible] ны сучаснаму стану фізіч[illegible] культуры і спорту ў рэспу[illegible] цы, комплексам «Раўбіч[illegible] «Палац воднага спорту», «Сп[illegible] кі». Спадзяёмся, што гас[illegible] зацікавяць і такія кнігі, як «[illegible] ларускія алімпійцы», «Белар[illegible] кія волаты».

Вялікую ўвагу мы ўдзя[illegible] ем падрыхтоўцы прадаўц[illegible] На курсах павышэння квал[illegible] кацыі, створаных пры ўпр[illegible] ленні кніжнага гандлю, яны [illegible] спецыяльнай праграме вы[illegible] чаюць англійскую, нямецкую [illegible] французскую мовы.

Чвэрць стагоддзя шчодра дорыць гледачам сваё майстэрства народны ансамбль танца «Палессе» Пінскага гарадскога Дома культуры. У рэпертуары калектыву каля 40 харэаграфічных твораў, аб'яднаных у тэматычныя цыклы «Беларусь мая, родны край», «Народаў дружная сям'я» і іншыя.

Беларускія, рускія, украінскія, малдаўскія, славацкія і румынскія мелодыі гучалі ў залах нашай краіны, а таксама і за мяжой: у Венгрыі, Польшчы, Балгарыі. Калектыў стаў лаўрэатам Сусветнага фестывалю моладзі і студэнтаў у Гаване, неаднаразова перамагаў на рэспубліканскіх і ўсесаюзных конкурсах. Сваім поспехам ансамбль танца «Палессе» ў многім абавязаны нязменнаму мастацкаму кіраўніку і балетмайстру заслужанаму дзеячу мастацтваў БССР І. Смірнову.

Калектыў рыхтуе новую праграму, з якой выступіць на маючых адбыцца гастролях у Індыі.

НА ЗДЫМКАХ: фрагмент з «Рабочай сюіты»; перад выхадам на сцэну.

Фота Э. КАБЯКА.

ЦІКАВАЯ ЭКСПАЗІЦЫЯ

Рабочы з Томска М. Папоў стаў паўмільённым наведвальні[illegible] Дома-музея Адама Міцкевіча ў Навагрудку. У кнізе водгукаў [illegible] клоннік таленту класіка польскай літаратуры пакінуў запіс, [illegible] ўручаны памятны сувенір.

У доме, дзе паэт правёў юныя гады, музей адкрыўся я[illegible] да вайны. Аднак фашысты разбурылі яго. Чвэрць стагоддзя на[illegible] будынак быў узведзены нанава. Мясцовыя жыхары дапамаглі [illegible] браць упалелыя экспанаты, многа іх паступіла з Масквы, Ле[illegible] града, Вільнюса. 16-томнае выданне твораў паэта і іншыя ма[illegible] рыялы перадалі супрацоўнікі Варшаўскага літаратурнага му[illegible] імя Адама Міцкевіча.

Цяпер экспазіцыя аб'ядноўвае каля пяці тысяч матэрыялаў, [illegible] тым ліку асабістыя рэчы, якія належалі паэту. Спецыяльныя р[illegible] дзелы, прысвечаныя А. Міцкевічу, адкрыты ў музеях пансіяна[illegible] «Свіцязь», калгаса імя Шчорса, сярэдняй школы № 1 Навагр[illegible] ка. За вялікую работу па прапагандзе літаратурнай спадчыны п[illegible] та Міністэрства культуры і мастацтва Польскай Народнай Р[illegible] публікі ўзнагародзіла музей знакам «За заслугі ў галіне по[illegible] скай культуры».

ЯК ВЫХОЎВАЕЦЦА ТАЛЕНТ

ПАСЕЯНАЕ ЎЗЫДЗЕ

Восенню 1977 года ў статорскую групу Беларускага тэатра оперы і балета быў прыняты спявак-барытон Віктар Скарабагатаў, які толькі што скончыў нашу кансерваторыю. Незадоўга да гэтага ён атрымаў першую прэмію на Усесаюзным конкурсе выканаўцаў савецкай песні і ў тэатр прыйшоў з рэпутацыяй спевака эстраднага плана. Таму спачатку мала хто верыў, што са Скарабагатава атрымаецца сапраўдны саліст оперы.

Але прайшло няшмат часу, і усё больш ясна стала выяўляцца аблічча спевака, здольнага іменна да опернага выканаўства, чалавека вельмі прадаздольнага і ўдумлівага.

Са стажораў ён праз год быў пераведзен у асноўны саставу трупы, апрача маленькіх партый усё часцей стаў спяваць вядучыя — Анегіна («Яўгеній Анегін»), Жэрмона («Травіята»), Валянціна («Фаўст»). У Скарабагатава выявіліся і схільнасці драматычнага артыста — ён добра выступіў у ролі Чытальніка ад аўтара ў спектаклі «Джардана Бруна», ролі, не пазбаўленай патэтычнага напалу. Усё часцей голас Віктара Скарабагатава гучаў па радыё, у перадачах тэлебачання, на канцэртных пляцоўках. І калі восенню 1979 года разам з групай маладых салістаў Віктар паехаў у Талін на чарговы Усесаюзны конкурс вакалістаў імя Глінкі, амаль ніхто не сумняваўся, што ён стане лаўрэатам. І на бліжэйшай тэатральнай прэм'еры — у «Севільскім цырульніку» Расіні — спявак выканаў ролю Фігара, адну з самых складаных у сусветным рэпертуары. Два гады работы з Віктарам адным калектыве далі мне магчымасць скласці аб ім пэўнае ўяўленне як аб перспектыўным артысце, вельмі сімпатычным чалавеку. Ён імгненна адгукаецца на любую просьбу, заўсёды гатовы прыняць удзел у бясплатным канцэрце, святочным прадстаўленні, дапамагчы выпусціць насценную газету, выканаць грамадскае даручэнне. Вельмі прыцягвае яго характар — роўны, адкрыты, добразычлівы. Мне хацелася даведацца, якім шляхам прыйшоў Віктар у опернае мастацтва. Не раз я спрабавала ўцягнуць яго ў размову на гэту тэму. Аднак пра сябе ён гаворыць неахвотна, таму што не бачыць у сваім «даоперным» жыцці нічога асаблівага. Мне ж тое-сёе здалося цікавым.

...Да 13 гадоў Віктар Скарабагатаў і музыка зусім спакойна жылі адзін без аднаго. Праўда, бацькі схадзілі з хлопчыкам на некалькі балетных спектакляў і оперу-казку «Церам-церамок», але тэатр не зрабіў на яго ніякага ўражання і хутка быў зусім забыты. Спакойнае існаванне без музыкі працягвалася да восьмага класа. Але вось там адбылося першае сур'ёзнае «сутыкненне».

Урок спеваў у вучняў восьмага класа сярэдняй школы № 22 г. Мінска лічыўся самым вольным і вясёлым. Але такіх адносін да свайго прадмета зусім не падзяляла настаўніца. Аднойчы яна строга пакарала Скарабагатава, які «развесяліўся» звыш меры. Яму загадалі стаць перад класам і... спяваць! Нікольки не бянтэжачыся — у дзяцінстве Віктар быў чалавекам смелым і рашучым,— ён праспяваў нейкую папулярную песню, чым выклікаў захапленне сяброў, і тут жа быў накіраваны ў вакальна-інструментальны ансамбль, нядаўна арганізаваны ў школе.

Настаўніца свята верыла ў выхаваўчую сілу мастацтва, асабліва ў адносінах да падлеткаў, якія вызначаліся, мякка кажучы, лішкам энергіі. Сабраўшы неяк 12—15 хлопчыкаў, яна сур'ёзна прапанавала ім: «Давайце спяваць без дзяўчынак». Гэтая ідэя выклікала гарачы энтузіязм. Праз год самаадданай работы ансамбль, названы «Рамантыкі», стаў займаць прызавыя месцы на розных аглядах самадзейнасці, аб ім пісала маладзёжная прэса. Да заканчэння школы Віктар Скарабагатаў быў салістам гэтага ансамбля.

Тут, пэўна, вытокі яго наступных дасягненняў на эстрадзе. А опера па-ранейшаму заставалася для Віктара нечым загадкавым. Маленькім прасветам можна назваць два музычныя фільмы — «Іяланта» і «Барыс Гадуноў». Яны зрабілі на юнака моцнае ўражанне,але карэнным чынам штонебудзь змяніць не здолелі.

Аднак вернемся да школы. Здадзены выпускныя экзамены, адгрымеў школьны баль, і былыя дзесяцікласнікі адправіліся гуляць па начному гораду... Выпадкова сустрэтая аб'ява аб прыёме ў музычнае вучылішча стала для Скарабагатава вызначальнай. Не перашкодзіла і тое, што Віктар быў маладзейшы, чым дыктавалі ўмовы прыёму на вакальнае аддзяленне.

А праз некалькі месяцаў вучобы Віктар Скарабагатаў быў прызваны на вайсковую службу і накіраваны ў ансамбль песні і танца Балтыйскага флоту. Тут і адбыўся пералом у свядомасці юнака. І рашаючую ролю ў гэтым працэсе адыгралі два чалавекі.

Адзін з іх — хормайстар ансамбля З. Масарскі, чалавек, улюбёны ў сваю справу. Ён па ўласнай ініцыятыве займаўся з матросамі два разы на тыдзень тэорыяй музыкі, сальфеджыо, чытаў лекцыі па гісторыі музычнага мастацтва. Пад яго кіраўніцтвам была сабрана добрая бібліятэка і падабрана фанатэка. А калі калектыў гастраляваў па гарадах краіны або за мяжой, Масарскі абавязкова наладжваў экскурсіі па славутых мясцінах, звязаных з музыкай. Сустрэча з Масарскім стала для юнака адкрыццём, а вось дружба з матросам Славам Кір'янавым — «ракавой».

Кір'янаў, у адрозненне ад Скарабагатава, з дзіцячых гадоў захапляўся оперным мастацтвам. Ён збіраў пласцінкі, кнігі, ноты. Яго ўяўленні аб галасах, манерах спеваў, гісторыі оперы і вакалу былі вельмі разнастайнымі і дастаткова глыбокімі. Ён пераканаў сябе, што ўсе свае веды павінен укласці ў чалавека, які здольны стаць сапраўдным оперным спеваком. У новым сябру, відаць, Кір'янаў бачыў дастойны аб'ект і аказаўся ўпартым настаўнікам. Ён прымушаў Скарабагатава кожны дзень слухаць оперы ў выкананні самых вядомых спевакоў, вадзіў яго на канцэрты і музычныя фільмы. І не дзіва, што праз два гады ўяўленні Віктара Скарабагатава аб сваім прызначэнні ў жыцці былі зусім яснымі — ён будзе оперным артыстам.

Наталля ПЕРВЯКОВА,
загадчыца літаратурнай часткі Дзяржаўнага акадэмічнага Вялікага тэатра оперы і балета БССР.

З МАЦЕРЫКА БЕЛАРУСКАЙ КУЛЬТУРЫ

У Празе, у Дзяржаўнай бібліятэцы Чэхаславацкай Сацыялістычнай Рэспублікі, выйшла ў канцы 1979 года кніга пад назваю «Славянская бібліятэка і славістыка». Яе складальнікі — доктар Ёзэф Стрнадэл і Маргарыта Кршэпіньска.

Беларуская тэматыка гэтага бібліяграфічнага падрахунку дзейнасці Славянскай бібліятэкі праследваецца па зафіксаваных артыкулах А. Мажэйкі, Л. Мірачыцкага, С. Панізніка, П. Сцяпанава... У кнізе, дарэчы, згадваюцца публікацыі газеты «Голас Радзімы»: нататкі А. Мажэйкі «Пра дружбу, якой 150 гадоў» (1969 г., № 20) і С. Панізніка «Славянская бібліятэка ў Празе» (1974 г., № 12).

У паведамленні д-ра Ё. Стрнадэла аб славістычным кангрэсе ў Варшаве прыпамінаецца і той факт, што ў час работы кангрэса дырэктар Інстытута мовазнаўства імя Якуба Коласа АН БССР М. Суднік перадаў у Прагу праз Ё. Стрнадэла медаль Якуба Коласа як ганаровае прызнанне заслуг Славянскай бібліятэкі ў прапагандзе беларускай літаратуры ў ЧССР.

У другой частцы згаданай кнігі можна знайсці артыкулы і рэцэнзіі на беларускую тэматыку супрацоўніка Славянскай бібліятэкі доктара Міраслава Зімы. Гэта ў першую чаргу яго праца «Умовы так званага пералівання імён у нацыянальныя формы паміж усходнеславянскімі мовамі» і іншыя даследаванні ў галіне транслітэрацыі беларускай мовы. Акрамя гэтага, аўтар падае прыклады практычнай транскрыпцыі славянскіх і іншых імёнаў у чэшскай мове.

У кнізе «Славянская бібліятэка і славістыка» змешчаны таксама іншыя рэцэнзіі і весткі з мацерыка беларускай культуры, літаратуры, мовазнаўства і гісторыі.

нашы славутыя землякі

СЕМ ПРЫГОД БОГУШ-СЕСТРАНЦЭВІЧА

Гадоў мо 150 назад пра гэтага чалавека гаварылі і пісалі даволі шмат. Цяжка толькі сказаць, хто больш — сябры ці ворагі. Даводзіўся ён дзядзькам нашаму пісьменніку і тэатралу В. Дуніну-Марцінкевічу. Аднак і сам па сабе Станіслаў Богуш-Сестранцэвіч — пос-таць, якіх нямнога было ў XVIII стагоддзі. Яго навуковая дзейнасць да гэтага часу застаецца мала даследаванай, а таму і мала вядомай шырокаму чытачу. А ён быў членам пецярбургскай Акадэміі навук, а па некаторых крыніцах, нават займаў нейкі час пасаду яе прэзідэнта. І зусім пэўна на-конт яго прэзідэнцтва ў Вольным эканамічным таварыстве, якое ў той час адыгрывала станоўчую ролю ў збіранні і вывучэнні розных крыніц, у тым ліку і пра Беларусь. Выбіраўся наш земляк ганаровым членам Маскоўскага, Віленскага, Кракаўскага універсітэтаў, членам сталічнай медыка-хірургічнай акадэміі (можа, гэта паўплывала, што і В. Дунін-Марцінкевіч у маладосці абраў медыцыну). У доўгім вірлівым жыцці Станіслава Богуш-Сестранцэвіча ніколі не было спакою, адных прыгод хапіла б на добры дзесятак чалавек.

ПРЫГОДА ПЕРШАЯ. ПРАМОВА Ў ПАМЯЦЬ ДЗЯДЗЬКІ

Месцам нараджэння Станіслава Іванавіча Богуш-Сестранцэвіча некаторыя даследчыкі называюць вёску Занькі былога Ваўкавыскага павета. Няхай сабе будзе і так, толькі, здаецца, у сваім жыцці ён сюды ні разу не прыязджаў. Здароўе малога Стася было надзвычай кволым, і бацькі хваляваліся за яго жыццё. Як толькі мінула ліха, аддалі хлопца вандроўнаму настаўніку. Выключная памяць, кемлівасць, дар красамоўства хутка вылучылі хлапчука сярод равеснікаў. Патрэбен быў толькі выпадак, каб яго заўважылі ўплывовыя асобы. А такі выпадак надарыўся... смерць роднага дзядзькі ў Старабубе. Паехаў 12-гадовы Стась з бацькамі на пахаванне і там выступіў з развітальным словам. Прамова настолькі ўразіла членаў кальвінскай абшчыны, што яны гуртам угаварылі бацьку паслаць сына вучыцца ў Еўропу. Пачуўшы згоду, яны сабралі грошы і паслалі самародка па веды.

ПРЫГОДА ДРУГАЯ. ПРАДАЎШЫ ПШАНІЦУ...

Новы навучальны год Станіслаў пачаў студэнтам у Крулеўцы (Кенігсберг). Прабыўшы тут адзін год, юнак прадоўжыў адукацыю ва універсітэтах Франкфурта, Амстэрдама, Лондана. У спрэчках быў вельмі гарачым, даваў грамадскім з'явам свае ацэнкі, адстойваў уласныя погляды.

Вярнуўся дамоў культурным, адукаваным чалавекам, ведаў некалькі замежных моў. У яго самога было жаданне прысвяціць сябе навуцы, аднак бацька вырашыў паспрабаваць сына ў гандлі. Паслаў яго ў Крулевец прадаваць пшаніцу. Бацька не памыліўся: Станіслаў з размахам павёў справу, няхепска зарабіў, але мясцовыя злодзеі выкралі грошы. Юнак хадзіў па вуліцах горада, думаючы, што рабіць далей. Ведаў, што вяртацца дамоў небяспечна: бацькаў суд будзе суровым.

ПРЫГОДА ТРЭЦЯЯ. ДУЭЛЬ

Журботны, маральна зламаны Станіслаў Сестранцэвіч трапіў на вочы зазывалу-вярбоўшчыку, які пачаў спакушаць юнака жыццём афіцэра, прапанаваў ісці ў валанцёры прускага гусарскага палка. У іншы час Сестранцэвіч і не падумаў бы аб гэтай службе, а тут лёгка згадзіўся. Яго палкая натура хутка выявілася: спрачаўся, даказваў сваю правату, патрабаваў справядлівасці. Тэмпераментны афіцэр удзельнічаў у дуэлі. Жывым застаўся, але раненне меў. Нарэшце, быў звольнены з войска і паехаў дамоў, каб працаваць у родным краі настаўнікам.

ПРЫГОДА ЧАЦВЁРТАЯ. КАПІТАН ЛІТОЎСКАЙ ГВАРДЫІ

Але прысвячэння ў настаўнікі не адбылося. Па дарозе падвярнуўся новы агітатар, на гэты раз з літоўскай гвардыі, і ўгаварыў паступіць на новую службу ў якасці харунжага. С. Сестранцэвіч становіцца капітанам літоўскай гвардыі. Па некаторых звестках, ён удзельнічаў у ваенных паходах і быў цяжка паранены. Пасля гэтага падаў у адстаўку і на гэты раз назаўсёды парваў з вайсковай службай.

(Заканчэнне на 8-й стар.).

ФІЛЬМ АБ БАЛЕЦЕ

Напярэдадні новага года на беларускім тэлебачанні адбылася прэм'ера фільма «Стварэнне» маладога рэжысёра Віктара Шавялевіча. Фільм гэты расказвае аб беларускім балеце, даследуе вытокі творчасці галоўнага балетмайстра Вялікага акадэмічнага тэатра оперы і балета БССР Валянціна Елізар'ева. У кінастужку ўвайшлі эпізоды з чатырох яго балетных спектакляў — «Стварэнне свету» А. Пятрова, «Кармэн-сюіта» Ж. Бізэ — Р. Шчадрына, «Ціль Уленшпігель» Я. Глебава, «Адажыета» Г. Малера.

Неўзабаве пасля прэм'еры на тэлебачанне прыйшлі першыя пісьмы, у якіх гледачы выказваюць словы падзякі пастаноўшчыкам фільма. Стужку пажадалі набыць многія зарубежныя краіны. Вось што расказвае аб гэтым фільме яго рэжысёр-пастаноўшчык В. Шавялевіч:

— Мы назвалі фільм «Стварэнне» не толькі таму, што ў ім прадстаўляем балет «Стварэнне свету». Дарэчы, менавіта ў гэтым балеце выкрышталізоўваецца творчая пазіцыя яго стваральніка, яго почырк. Барацьба Дабра і Зла, стварэнне свету, чалавека, яго ўслаўленне — вышэйшая маральная тэма ў творчасці Елізар'ева.

«ЗАЛАТАЯ» ЗНАХОДКА

Незвычайная і рэдкая знаходка трапіла нядаўна даследчыкам Беларускага дзяржаўнага універсітэта. Упершыню ў Беларусі знойдзены залатыя і сярэбраныя каштоўнасці тонкай ажурнай работы, выробленыя невядомымі майстрамі сярэдзіны XIII стагоддзя.

На працягу трох год на тэрыторыі Рагачоўскага раёна ў летні час працавала экспедыцыя кафедры археалогіі, этнаграфіі і дапаможных гістарычных дысцыплін.

Экспедыцыя раскопвала паблізу вёскі Вішчын рэшткі баярскага замка часоў Кіеўскай Русі, які стаяў на беразе Дняпра на шляху з варагаў у грэкі. На думку вучоных, паселішча было знішчана вялікім пажарам, у выніку нападу знянацку нейкага моцнага ворага. Потым на гэтым месцы жыццё ўжо ніколі не ўзнаўлялася. І ў зямлю трапілі ўсе рэшткі, якія полымя нейкім чынам не закранула. Таму даследчыкаў, што прыйшлі сюды амаль праз восем стагоддзяў, напаткала сапраўдная ўдача.

У час раскопак былі выяўлены рэшткі драўлянай крапасной сцяны, многа зброі конных воінаў, розныя бытавыя рэчы. Але леташняя знаходка нездарма названа «залатой». У ёй рэчы, якія ў вялікай паспешлівасці закапаў у зямляны вал іх уладальнік: набор жаночых упрыгажэнняў, золата і кавалкі серабра, такзваныя грыўні (усіх трох існаваўшых тады тыпаў) — першыя рускія рублі. Тут знаходзіліся падвескі на тонкіх ажурных ланцужках са складаным перапляценнем, колты — вельмі каштоўныя нагалоўныя аздобы багатай жанчыны, бранзалеты, упрыгожаныя арнаментамі і фігуркамі казачных птушак.

У рукі даследчыкаў трапілі дзве вельмі цікавыя рэчы, падобныя на медальёны. Вырабы вызначаюцца вялікім майстэрствам і мастацкім густам. Гэта яшчэ адзін бясспрэчны доказ таго, якіх вяршынь у сваёй творчасці дасягнулі майстры «па злату і срэбру» старажытнай Русі, і сведчанне трывалых гандлёвых сувязей яе заходніх земляў са стольным горадам Кіевам.

Агульная вага знаходкі складае каля двух з палавінай кілаграмаў.

С. РАТГАУЗ.

НА ЗДЫМКАХ: навуковую апрацоўку клада вядуць (справа налева) загадчык кафедры археалогіі, этнаграфіі і дапаможных гістарычных дысцыплін Э. ЗАГАРУЛЬСКІ, лабарант кафедры Т. ЖУКАВА і ўдзельнік экспедыцыі студэнт II курса гістарычнага факультэта А. АЛЯКСЕЕЎ; сярэбраныя браслет і падвеска з ланцужкамі; частка Вішчынскага клада сярэдзіны XIII стагоддзя.

Фота У. ВІТЧАНКІ.



СЕМ ПРЫГОД БОГУШ-СЕСТРАНЦЭВІЧА

(Заканчэнне. Пачатак на 7-й стар.).

ПРЫГОДА ПЯТАЯ. АБМАНУТАЕ КАХАННЕ

Радзівілам патрэбны былі хатнія настаўнікі, і Станіслава Сестранцэвіча ахвотна ўзялі на гэту пасаду. Здавалася, ён знайшоў і сваё вялікае каханне. Справа ішла да вяселля, але дачка Радзівіла паставіла ўмову: жаніх павінен перайсці ў каталіцтва. Чаго не зробіш дзеля каханай! І вера пераменена. А вось шлюб так і не адбыўся. Усё было прадумана і хітра сплецена. Здольнасці маладога настаўніка, яго талент выраслі выкарыстаць віленскія клерыкалы.

ПРЫГОДА ШОСТАЯ. ПРОПАВЕДЗЬ, ЯКАЯ ДАЙШЛА ДА РУСКАЙ ІМПЕРАТРЫЦЫ

Па ўгавору віленскага біскупа Масальскага С. Богуш-Сестранцэвіч закончыў Варшаўскую галоўную школу піраў. За адзін толькі 1763 год зрабіў нечуваную кар'еру ў ролі духоўнага служыцеля. Нейкі час меў вялікі прыход у Гомелі, але польскі кароль пажадаў яго трымаць у Вільні. Пасля няўдалага замаху ў лістападзе 1770 года на караля С. Панятоўскага С. Богуш-Сестранцэвіч выступіў з аратарскімі казаннямі, якія дайшлі да Варшавы і Санкт-Пецярбурга. Па асабістаму выбару Кацярыны II Станіслаў Богуш-Сестранцэвіч прызначаецца кіраўніком новаствораной беларускай епархіі. Фактычна ён узначаліў усю каталіцкую царкву Расіі.

Чаму імператрыца выбрала яго? У асобе Богуш-Сестранцэвіча яна бачыла хітрага палітыка, рашучага чалавека, здольнага спыніць экспансію Ватыкана на ўсходзе. Яе абраннік не быў католікам ад нараджэння, а стаў ім пры злых абставінах, затаіўшы ў сэрцы помсту супраць той, якая прывяла яго на гэтую дарогу.

У Пецярбургу С. Богуш-Сестранцэвіч знаёміцца з вучонымі, якія рабілі на яго дабратворны ўплыў. Паступова пачынае займацца даследаваннямі ў галіне гуманітарных навук. Маючы поўную падтрымку і давер з боку Кацярыны II, ён часта выязджаў на Беларусь, збіраў матэрыялы для ўласных работ па гісторыі, мовазнаўству. Адначасова ён энергічна ўмешваўся ў барацьбу з езуітамі, пратэставаў супраць разумовага паняволення імі дзяцей, выступаў супраць схаластыкі і пустазвонства, адчыняў новыя школы на Беларусі, быў прыхільнікам распаўсюджвання гуманістычных ідэй Заходняй Еўропы.

Паводзіны С. Богуш-Сестранцэвіча былі не па душы папству. Вакол яго плялося многа інтрыг. І ўсё ж па настаянню Кацярыны II Ватыкан вымушаны быў здацца: мітрапаліт С. Богуш-Сестранцэвіч насіў знак кардынала.

ПРЫГОДА СЁМАЯ. ІНТРЫГІ І ССЫЛКА

З прыходам на пр Паўла I інтрыганы з Ва на пастараліся выкарыс новую сітуацыю, каб ра віцца з Богуш-Сестран чам. У 1800 годзе ён бы сланы ў Буйнічы пад лёвам пад нагляд мясц губернатара. Тут С. Бо Сестранцэвіч цалкам пр ціў сябе навуковай рабо ў вольны час — творч Тэмай яго навуковай ра была гісторыя роднага к Яго займала праблема ходжання славян.

Да Сестранцэвіча ў Б чы прыязджалі сябры, кі, калегі. Імператару н дабалася такое паломн да апальнага дзеяча, было загадана адпр С. Богуш-Сестранцэвіча лескую глухамань—ма Малатыч з «воспрещ доступа посторонних Толькі творчая праца ра ла адстаўнога кардынал адчаю.

Пасля смерці Паў С. Сестранцэвіча не т аднавілі ў ранейшым але і надалі яму год мітрапаліта і вярнулі ў ночную сталіцу, дзе ён маў ласку і ўзнагароды.

Аднак у гэты час С. ранцэвіч усё больш час дае творчай працы, мног ракладае з еўрапейскіх На жаль, ён не паспеў у напісанае апублікаваць, му большасць яго прац здабыткам архіваў і ру ных аддзелаў бібл Жыццё ішло на спад. жыў Станіслаў Іванавіч туш-Сестранцэвіч 95 гад

* * *

С. Богуш-Сестранцэвіч быў царкоўным дзеячам сіі ў вузкім разуменні г паняцця. Ён заяваваў аўтарытэт сваёй навук дзейнасцю, і гэта вы ацэньвалася прагрэсіў колам.

У 1793 годзе ў Маг выйшла гісторыка-краяз чая работа «Аб Заходняй сі», у якой з пазіцый п да ўсіх славян аўтар ра даў праблемныя пытанн ходжання беларусаў, ук цаў, рускіх. С. Богуш-С ранцэвіч напісаў та «Літоўскую граматы якую нельга ўспрымац прамым сэнсе літоўскай хутчэй — беларускай, бо тарычным імем Літва тады называлі і Белару

Вядома, што ў 1872 г А. Вярыга-Дарэўскі аб даваў частку спадчыны нага, якая захоўвала прыватнай бібліятэцы П раў. Мы ведаем, што ў стагоддзі ў Магілёве С. ранцэвіч паставіў сваю гедыю «Гіцыя ў Таўры падпісаўся псеўданімам тар гісторыі таўрыцкай жа пісаў вершы на лаці і польскай мовах. Мяр ца, што С. І. Богуш-Сес цэвіч арганізаваў у Маг друкарню, з якой выхо не толькі яго і іншых аў кнігі, але і мясцовыя к дары.

Генадзь КАХАНОЎС

Спорт

КУПРЭЙЧЫК — ГРОСМАЙСТАР

На міжнародным турніры ў Рэйк'явіку ўдала выступіў мінскі шахматыст В. Купрэйчык. Ён заняў першае месца, набраўшы 8,5 ачка з 12 магчымых, і перавыканаў гросмайстарскую норму.

З СУСВЕТНЫМ РЭКОРДАМ

У Ленінградзе адбыўся другі ў гісторыі спорту зімовы матч СССР — ЗША па лёгкаатлетычнаму сямібор'ю. За савецкую каманду выступалі і два беларускія спартсмены: А. Неўскі з Гомеля і магіляўчанін В. Масціпанаў. Вялікага поспеху дабіўся Аляксандр Неўскі, які ўпэўнена заняў першае месца. Яго вынік — 6 043 ачка — новае сусветнае дасягненне. Акрамя гэтага, паралельна ішоў і чэмпіянат СССР. Такім чынам, чэмпіёнам краіны стаў Аляксандр Неўскі.

Можна лічыць нядрэнным і вынік В. Масціпанава, які ўвайшоў у дзесятку мацнейшых. Упэўненую перамогу ў гэтым спаборніцтве атрымалі мнагаборцы Савецкага Саюза. Яны апярэдзілі спартсменаў ЗША амаль на дзе тысячы ачкоў.

МАЦНЕЙШЫЯ НА КАНТЫНЕНЦЕ

Добры «ўраджай» медалёў на чэмпіянаце Еўропы ў Нарвегіі сабралі савецкія стралкі з пнеўматычнай зброі. Яны заваявалі 12 з 16 залатых, 5 сярэбраных і 3 бронзавыя медалі.

Чэмпіёнамі кантынента ў савецкай камандзе сталі сярэбраны прызёр манрэальскай Алімпіяды мінчанін А. Кядзяраў—стральба па мішэні «бягучы дзік» — і І. Басінскі з Гродна, які перамог у стральбе з пісталета. Акрамя асабістых узнагарод, і Кядзяраў, і Басінскі атрымалі залатыя медалі за камандныя спаборніцтвы.

«ПАРУШАЛЬНІК» СПАКОЮ

За апошнія гады ў Беларусі з'явілася нямала маладых выдатных шашыстаў. Таму, як правіла, кожнае першынство прыносіць сюрпрызы. Не абышлося без нечаканасцей і на нядаўнім чэмпіянаце рэспублікі, які адбыўся ў Мінску. «Парушальнікам» спакою на гэты раз стаў кандыдат у майстры спорту В. Ефіменка з Гродна. Ён апярэдзіў сем майстроў спорту і заняў ганаровае чацвёртае месца, упершыню выканаўшы нарматыў майстра спорту.

А чэмпіёнам Беларусі па рускіх шашках пасля васьмігадовага перарыву стаў старшы выкладчык Беларускага інстытута механізацыі сельскай гаспадаркі Г. Хацкевіч. Адно ачко ўступіў яму гросмайстар А. Плакхін. Трэцім быў майстар спорту з Мінска Б. Агашын. Прычым, два першыя прызёры не прайгралі ніводнай партыі. Г. Хацкевіч атрымаў права абараняць гонар рэспублікі на чэмпіянаце краіны.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ

НАШ АДРАС:

МІНСК-ГСП, ЛЕНІНСКІ ПРАСПЕКТ, 44.
ТЭЛЕФОНЫ: 33-01-97, 33-02-80, 33-03-15, 33-16-56, 33-07-8

Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КП Беларусі.
Зак. 467